

ВОЙСКАМ СУВЯЗІ — 100 ГАДОЎ

4

АЎГУСТОЎСКІ КАНАЛ — У СПІС СУСВЕТНАЙ СПАДЧЫНЫ

8




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. АЎТОРАК № 201 (29068)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іна МЯДЗВЕДЗЕВА, старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта:**

*«Працэнт беларусаў, якія самастойна прайшлі перапіс насельніцтва па інтэрнэце, адпавядае лічбе, што ў пачатку кампаніі прагназаваў Белстат. Я задаволена тым, як прайшоў інтэрнэт-перапіс. У нас 21 % ад колькасці насельніцтва перапісалася па інтэрнэце — гэта вельмі добрая лічба. Мы на яе разлічвалі, і гэта была наша ацэнка, калі набіралі перапісчыкаў, ацэньвалі іх колькасць. На стацыянарных участках і ў інтэрнэце перапісалася 4,9 мільёна чалавек. Адпаведна, нагрузка на перапісчыкаў на пакінутыя дні зменшылася ў два разы».*

# Дзядулева энцыклапедыя



Унікальную, сапраўды тытанічную працу правёў жыхар гарадскога пасёлка Бешанковічы Анатоль КРАЧКОЎСКІ, каб падрыхтаваць два тамы энцыклапедый пра свой раён. Першая энцыклапедыя называецца «Бешанковіччына», другая — «Памяць». Ад старажытнасці да нашых дзён», над якімі былы супрацоўнік раённай газеты і дырэктар гісторыка-краязнаўчага музея працаваў амаль сорак гадоў, скрупулёзна вывучаючы рэдкія архіўныя дакументы, пісьмы і гістарычныя артыкулы. Анатоль Вячаслававіч, які сёння ўжо на пенсіі, называе сябе укладальнікам энцыклапедый, хоць на самай справе ён паўнавартасны аўтар, у тым ліку і дызайнер, і наборшчык, і стыліст-моваўвед, і карэктар у адной асобе. Толькі ў энцыклапедыі «Памяць» налічваецца 709 каляровых старонак. Пакуль гэтыя кнігі існуюць толькі ў адным экзэмпляры — каб выдаць іх хоць невялікім накладам, патрэбны значныя сродкі.

На гэтым фота стваральнік энцыклапедычных фаліянтаў Анатоль Крачкоўскі паказвае свае рукапісы ўнучцы Альбіне ЖУРКО і яе сяброўцы Соні ПЯСЕЦКАЙ, далучаючы дзяўчынак да гісторыі роднага краю.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **ЦВК акрэдытавала больш за 330 назіральнікаў ад СНД для маніторынгу выбараў у Парламент.**
- На пагашэнне і абслугоўванне дзяржаўнага доўгу ў 2020 годзе ў Беларусі спатрэбіцца Br8,7 млрд.
- **Беларускі пісьменнік Пятро Васючэнка пасмяротна намінаваны на самую прэстыжную міжнародную прэмію ў сферы дзіцячай літаратуры — ALMA Astrid Lindgren Memorial Award.**
- Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў Беларусі сёння, 22 кастрычніка, з-за туману.
- **Больш за сем тысяч актаў аб крадзяжы электраэнергіі склалі супрацоўнікі «Мінскэнерга» з пачатку года.**

ISSN 1990 - 763X

Нерухомасць і грошы

# ПАДАТКУ НА БАГАЦЦЕ НЕ БУДЗЕ,

## але маёмасны трэба плаціць

### Дэдлайн — 15 лістапада

**Да сярэдзіны лістапада нашым грамадзянам трэба заплаціць зямельны падатак і падатак на нерухомасць. Тым, хто пратэрміне або забудзе ўнесці падатак, пагражаюць штраф, пені і ў выключных выпадках вас могуць не выпусціць з краіны. Але гэта, па рашэнні суда...**



**Спачатку адкажам на тры галоўныя пытанні: дзе яго выплаціць? Што рабіць, калі няма паведамлення? Як плаціць падатак у АРІП?**

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Міхаіл РАСОЛЬКА** ўдакладняе, што аплаціць збор можна любым зручным для плацельшчыка спосабам: наяўнымі праз банк, дома на канапе запаўняючы графу інтэрнэт-банкінгу, праз пошту, падатковую інспекцыю, сельскія саветы.

СТАР. 7

Педагагічная майстэрня

# СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ

## Як EdCamp Belarus натхняе педагогаў працаваць у сучасным фармаце

**«Урааааааа!!!!!». «Я так разумею, што мы хутка сустрэнемся?». « Аналагічная радасць. На адной хвалі». «І я, і я, і я!». «Праўда, як жа класна, калі людзі з розных куточкаў Беларусі разумеюць, пра што гаворка. Да сустрэчы, сябры». «Хутка пабачымся». Такімі эмоцыямі дзяліліся ў «Фэйсбуку» педагогі, якія атрымалі запрашэнне на EdCamp Belarus — 2019. Настаўнікі адлічвалі дні да яго пачатку, як дзеці ў чаканні Новага года.**

### ПА ДОБРАЙ ВОЛІ

Педагагічная (не)канферэнцыя прайшла ў сталічным клубе «Імагуру» ўжо трэці раз з нязменным аншлагам. У свае выхадныя дні настаўнікі з усёй краіны прыехалі ў сталіцу, каб падзяліцца адно з адным самымі сучаснымі педагагічнымі практыкамі або проста паслухаць майстар-класы ад «гуру» педагогікі. Галоўны прынцып форуму — добраахвотнасць: «дай, калі можаш, вазьмі — калі хочаш».

Усе тут могуць быць як спікерамі, так і слухачамі. Могуць прапанаваць сваю педагагічную ідэю, агучыць праблему і шляхі яе вырашэння, зыходзячы з уласнага досведу, правесці майстар-клас, а могуць проста прагаласаваць за тое, што хочуць пачуць.

СТАР. 12

# УРАЛЬСКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

## Тавараабарот паміж Свярдлоўскай вобласцю Расіі і Беларуссю можа ўстанавіць новы рэкорд

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з расійскай дэлегацыяй на чале з губернатарам рэгіёна Яўгенам Куйвашавым.**

Свярдлоўская вобласць, нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, — традыцыйна надзейны і перспектыўны партнёр Беларусі. Мы працуем там даўно і паспяхова, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. І жыхары рэгіёна, і людзі далёка за яго межамі добра знаёмыя з беларускімі прадуктамі харчавання, абуткам, тэкстылем, бытавой тэхнікай, мэбляй. Значную долю ў аб'ёмах узаемнага гандлю займаюць сумесныя праекты ў галіне энергетыкі. На Урале выраблена 60 працэнтаў турбін, якія выкарыстоўваюцца ў Беларусі.

У шэрагу перспектыўных кірункаў Аляксандр Лукашэнка назваў машынабудаўнічую галіну. Для прыкладу ён прапанаваў удзел «Белкамунмаша» ў мадэрнізацыі трамваяў, зборку дызельных рухавікоў для БелАЗаў разам з екацярынбургскай кампаніяй «Сінара — Транспартныя машыны», удзел беларускіх кампаній у абнаўленні гарадскога пасажырскага транспарту, у тым ліку за кошт электробусаў.

Кіраўнік дзяржавы таксама расказаў пра беларускія напрацоўкі па стварэнні сістэмы дыспетчарызацыі рэгулярных гарадскіх транспартных зносін, гатоўнасць краіны ўдзельнічаць у забеспячэнні Урала сельскагаспадарчай, аўтамабільнай, дарожна-будаўнічай, камунальнай тэхнікай.

«У нас ёсць магчымасць для развіцця новых кірункаў супрацоўніцтва і ў навуцы, і ў сельскай гаспадарцы, — дадаў беларускі лідар. — Беларускія спецыялісты таксама прапануюць свае інжынірынгавыя паслугі пры будаўніцтве сацыяльных аб'ектаў, аўтадарог, мастоў, смеццеперапрацоўчых комплексаў. Я ведаю, вы вельмі шмат будуеце, у вас вялізныя планы, вы — адзін з вядучых рэгіёнаў па будаўніцтве. Калі вам патрэбна будзе наша падтрымка і дапамога ў гэтым, калі ласка, «пад ключ», калі трэба. Асабліва гэта актуальна пры падрыхтоўцы да Сусветнай летняй універсіяды, якая ў 2023 годзе адбудзецца. У нас ёсць пэўны ў гэтым плане вопыт, бо мы сёлета правялі маштабныя Еўрапейскія гульні, лёгкаатлетычны матч Еўропа—ЗША».

Што датычыцца сельскай гаспадаркі, то ў Беларусі ўжо ёсць вопыт па будаўніцтве і абсталяванні агракомплексаў у паўночных рэгіёнах. «Я часта прыводжу ў прыклад Сахалін, гэта нашмат далей, і там мы стварылі ўнікальны для гэтага рэгіёна комплекс, каб паказаць, што там можна выбраць сельгаспрадукцыю і развіваць сельскую гаспадарку. Гэта закончаны комплекс ад вытворчасці да сацыяльнай сферы», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.

**● Да ведама**

Па выніках 2018 года тавараабарот паміж Беларуссю і Свярдлоўскай вобласцю перавысіў 431 мільён долараў. У студзені — жніўні 2019 года ўзаемны гандаль склаў амаль 306 мільёнаў долараў.

Адлегласць паміж Мінскам і Екацярынбургам — амаль 2,5 тысячы кіламетраў. Прамых авіярэйсаў няма, дарога на цягніку займае каля двух сутак.

Асобна Аляксандр Лукашэнка спыніўся на перспектывах супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. «Мы вельмі ганарымся нашымі культурнымі сувязямі, — падкрэсліў ён. — Наш агульны гонар — Валодзя Мулявін, якога я вельмі добра ведаў, з якім сябраваў. Пасля нацыяналістычнага чаду (некалькі гадоў у Беларусі і гэта было) мне прыйшлося яго як нашага, рускага, чалавека падымаць на вышыню, і я адразу беларусам сказаў, што гэты расіянін навучыў нас размаўляць на беларускай мове».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра падарунак Свярдлоўскай вобласці беларусам — помнік знакамітаму беларускаму «песняру», ураджэнцу Свярдлоўска. «Мы вельмі ўважліва адносімся да памяці аб Уладзіміру Мулявіне, падтрымліваем яе. Уся яго творчасць дагэтуль гучыць у Беларусі, быццам ён жывы», — сказаў ён.

Напрыканцы вітальнай прамовы кіраўнік дзяржавы выказаў спадзяванне, што ў хуткім часе ўзаемны гандаль можа перавысіць рэкорд 2012 года — 600 мільёнаў долараў. Ён прапанаваў дэталёва абмеркаваць канкрэтныя шляхі для дасягнення гэтай мэты і назваў Беларусь і Свярдлоўскую вобласць — апорамі Саюзнай дзяржавы.

У сваю чаргу губернатар Свярдлоўскай вобласці заўважыў, што члены дэлегацыі, у складзе якой знаходзяцца заканатворцы, міністры, прадстаўнікі бізнесу, спецыялісты будаўнічай і IT-сферы, ужо правялі папярэднія перамовы з беларускімі партнёрамі аб развіцці і ўмацаванні двухбаковага супрацоўніцтва. «Адносіны паміж Свярдлоўскай вобласцю Расійскай Федэрацыі і Беларуссю заўсёды былі прыкладам шчырай дружбы і шчырага руху насустрач адно аднаму», — сказаў Яўген Куйвашаў.

Губернатар дадаў, што дэлегацыя прыехала ў Мінск з некалькімі канкрэтнымі прапановамі па развіцці супрацоўніцтва, у тым ліку ў галіне машынабудавання. «Для нас Беларусь сёння, як заўсёды, з'яўляецца стратэгічным партнёрам, — сказаў ён. — Асаблівы кіраўнік — прамысловая каапрацыя».

**● У тэму**

У размове з журналістамі губернатар Свярдлоўскай вобласці нагадаў пра план па павелічэнні і пашырэнні супрацоўніцтва, які быў намечаны ў 2014 годзе, падчас яго першай сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам. Па яго словах, рэалізацыя плана прынесла плён: летась узаемны тавараабарот узрос на 18,3 працэнта, такая ж дынаміка захоўваецца сёлета.

Папярэднія дамоўленасці, дасягнутыя падчас гэтага візіту, звязаны з машынабудаваннем. Яўген Куйвашаў паведаміў журналістам, што БелАЗ з рухавіком уральскай вытворчасці прайшоў выпрабаванні і ўжо з'ехаў працаваць на кар'ер.

Цікавіць свярдлаўчан камунальная тэхніка. Па-ранейшаму 60 працэнтаў тэхнікі для аграпрамысловага комплексу закупляецца ў Беларусі, пашырэнне лінейкі тут не прыпыняецца.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў нашай краіне Дзмітрый Мезенцаў назваў Беларусь адным з лідараў па станаўленні новых інстытутаў развіцця, а Парк высокіх тэхналогій — унікальным праектам з надзвычайнымі льготамі. На думку пасла, лічбавізацыя — яшчэ адзін пункт судакранання паміж Беларуссю і Свярдлоўскай вобласцю.

**Варвара МАРОЗАВА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Медыйны дыялог напярэдадні візіту

## Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю найбуйнейшаму казахстанскаму інфармагенцтву

**Перад афіцыйным візітам кіраўніка Беларусі ў Казахстан, які запланаваны на 24—25 кастрычніка, Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні інфармацыйнага агенцтва «Хабар», самага буйнога ў Казахстане. Узнятыя тэмы датычыліся ў тым ліку бачання Прэзідэнта перспектыў развіцця гандлёва-эканамічных адносін паміж дзяржавамі, у прыватнасці магчымасці закупкі казахстанскай нафты і павелічэння паставак беларускіх прадуктаў.**

На пытанне, ці захаваецца пераемнасць у адносінах паміж дзяржавамі, Прэзідэнт даў адназначна станоўчы адказ. «Вы згадалі новага Прэзідэнта Казахстана. Вы ведаеце, уся яго палітыка — па працяг тых працэсаў, якія не толькі паміж Беларуссю і Казахстанам намечаны, а на развіццё нашага агульнага эканамічнага саюза. Касым-Жамарт Такаеў — гэта не проста чалавек, які можа прадоўжыць, ён можа прымножыць рэаліі, якія існуюць у нашых адносінах. Ёсць аснова, ёсць мэта, і мы яе будзем прытрымлівацца. Паверце, мы прыбавім, у нас адносіны будуць яшчэ лепшыя», — выказаў упэўненасць беларускі лідар.

Зайшла гаворка і пра будучыню ЕАЭС. Аляксандр Лукашэнка перакананы, што гэтая інтэграцыя адбылася, прызнаная шматлікімі дзяржавамі свету, якія хочуць супрацоўнічаць з саюзам. Але ў той жа час ёсць маса праблем, якіх быць не павінна.

«Асабліва вось гэтыя бар'еры. Мы мусім нашы прадпрыемствы ставіць у роўныя ўмовы. Не павінна мацнейшая краіна ствараць для сваіх прадпрыемстваў найбольш выгадныя ўмовы і тарпедаваць пастаўкі прадукцыі, дапусцім, з Беларусі на расійскі рынак ці казахстанскі, ці іншыя нейкія рынкі. Калі мы ствараем саюз, значыць, трэба прасоўвацца наперад», — лічыць Прэзідэнт.

Ён адзначыў: дагэтуль існуе памылковы тэзіс пра тое, што Еўрапейскі саюз стварыўся дзесяцігоддзямі, а ЕАЭС толькі з'явіўся і таму не можа адразу стаць моцным, аўтарытэтным. Але, нагадаў Аляксандр Лукашэнка, Еўрапейскі саюз — гэта розныя краіны, якія не мелі досведу сумеснага жыцця, як постсавецкія рэспублікі. «Мы ж жылі ў адной краіне, у нас велізарны вопыт! — адзначыў Прэзідэнт. — У нас вось гэта аснова, у нас адзіная мова, у нас шмат агульнага. Таму мы гэтым шляхам можам прайсці хутчэй за Еўрапейскі саюз. Так, мы павінны бачыць: што ў іх не атрымалася, і не рабіць памылак. Трэба вучыцца на чужых памылках. Але ісці мы можам больш хутка, таму што ў нас больш досведу».

Пасля інтэрв'ю старшыня праўлення агенцтва «Хабар» Ярлан Бякхожын расказаў журналістам аб размове з Прэзідэнтам.

«Вельмі цікавы суразмоўнік, які падкупляе ў гутарцы сваёй шчырасцю, што ўвогуле нехарактэрна для палітыка... Думаю, што калі нейкі апанент пачынае з ім спрачацца, праз нейкі час становіцца прыхільнікам, — настолькі шчыра і пераканаўча ён можа расказваць. Таму размова адбылася вельмі жывая, цікавая, пазнавальная», — падзяліўся ўражаннямі ён.

Кіраўнік агенцтва расказаў, што падчас інтэрв'ю прагучалі і пытанні асабістага характару: напрыклад, што адбываецца з ураджаем бульбы і кавуноў, сабраным Прэзідэнтам Беларусі. Адпаведнае відэа, распаўсюджанае праз сацсеткі, імгненна стала папулярным у Казахстане.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Масавыя беспарадкі ў Чылі пасля павышэння цэн на метро



Пратэсты, якія перараслі ў беспарадкі і сутыкненні з паліцыяй, пачаліся ў Сант'яга ў мінулы панядзелак, 14 кастрычніка, пасля таго як кошт праезду ў метро ў сярэднім вырас на 30 песа (4 цэнты) да максімуму ў 850 песа (1,2 долара). Пазней беспарадкі ахапілі і іншыя гарады краіны.

У ходзе акцый пратэсту супраць павышэння цэн на праезд у метро было затрымана больш за 1,4 тысячы чалавек, 62 супрацоўнікі паліцыі атрымалі раненні.

Дзесяць чалавек загінулі, большасць з іх сталі ахвярамі пажараў у гандлёвых цэнтрах, якія пачалі рабаваць падчас беспарадкаў.

У сувязі з сітуацыяй, якая склалася, абвешчана надзвычайнае становішча ў сталіцы і шэрагу іншых гарадоў краіны. У Сант'яга, Кансэпсьёне і Вальпараіса з 20 кастрычніка быў усталяваны каменданцкі час. Нягледзячы на ўведзеныя меры, у гарадах зноў былі зафіксаваныя беспарадкі, рабаванні і выпадкі марадзёрства.

Прэзідэнт краіны Себасцьян Піньера прыняў рашэнне адмяніць планаванае павышэнне цэн на праезд у грамадскім транспарце.

## Шцірліц лепш за ўсё адпавядае ўяўленням расіян пра ідэальнага палітыка

Галоўны герой фільма «Сямнаццаць імгненняў вясны» савецкі разведчык Шцірліц лепш за ўсё з персанажаў айчыннага кіно адпавядае ўяўленням аб ідэальным палітыку. Пра гэта сведчаць вынікі апытання УЦВГД, апублікаваныя ўчора.

За такі варыянт выказалася 20 % апытаных. 12 % лічаць, што якасці, неабходныя расійскаму палітыку, лепш за ўсё ўвасабляе герой фільма «Сабачае сэрца» прафесар Праабражэнскі. На трэцім месцы аказаліся Даніла Багроў з кінастужак «Брат» і «Брат-2» і Марыя Швяцова з серыяла «Таямніцы следства» (па 11 %). 13 % апытаных не змаглі адказаць на пытанне.

Сярод якасцяў, неабходных для ідэальнага палітыка, рэспандэнты часцей за ўсё называлі сумленнасць (44 %), адукаванасць (31 %), блізкасць да народа (26 %), уменне эфектыўна арганізаваць работу іншых людзей (25 %). 76 % апытаных былі б гатовыя прагаласаваць на выбарах за кінаперсанажа, найбольш адпаведнага, на іх думку, вобразу ідэальнага палітыка. 20 % апытаных не сталі б галасаваць за названага імі героя.

## Роберт Кенедзі-малодшы: у перыяд Карыбскага крызісу ў ЦРУ быў «крот», якога так і не знайшлі

Савецкая разведка змагла ўкараніць у ЦРУ ЗША ў перыяд, які папярэднічаў Карыбскаму крызісу, свайго агента, вылічыць якога амерыканскаму боку з тых часоў так і не ўдалося. Пра гэты эпізод эпохі «халоднай вайны» расказаў у інтэрв'ю першаму намесніку генеральнага дырэктара ТАСС Міхаілу Гусману пляменнік амерыканскага прэзідэнта Джона Кенедзі і сын міністра юстыцыі, генеральнага пракурора ЗША Роберта Кенедзі, асноўнага перагаворшчыка з амерыканскага боку падчас Карыбскага крызісу, прафесар Роберт Кенедзі-малодшы.

«Гаворачы пра савецка-амерыканскія адносіны, варта сказаць, што ў ЦРУ дзейнічаў так званы «крот»(укаранёны агент. — **Заўв. рэд.**), якога так і не выявілі, — адзначыў Роберт Кенедзі-малодшы. — Мы да гэтага часу не ведаем, хто гэта быў».

Па сведчанні нашчадка Бобі Кенедзі, «крот» паспяхова працаваў і ў выніку яго дзейнасці, своечасова перарываліся спробы амерыканскіх спецслужбаў абзавесціся ўласнымі агентамі ў найвышэйшых эшалонах улады ў СССР. «Як толькі ЦРУ засылала сваіх агентаў у Крэмль, іх знішчалі па інфармацыі «крата». І ў выніку ЦРУ не было нічога вядома аб тым, што адбываецца ў Крамлі», — заявіў Роберт Кенедзі-малодшы.

У сувязі з гэтым ён прызнаў, што 35-ы прэзідэнт ЗША Джон Кенедзі не атрымліваў у перыяд Карыбскага крызісу, які пачаўся ў кастрычніку 1962 года, ніякіх звестак аб планах першага сакратара ЦК КПСС, старшыні Савета Міністраў СССР Мікіты Хрушчова, бо амерыканскай разведцы проста не ўдавалася здабываць такія звесткі.

Надвор'е

# Акорды бабінага лета

## Чакаецца сонечнае надвор'е, і нават уначы з добрым плюсам


Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

**Цёплае сухое надвор'е будзе ў нашай краіне на гэтым тыдні: у сярэдзіне восені прырода радуе яркім сонцам. Будзе пераважаць антыцыклanальны характар надвор'я. Захаваецца цяпло, будзе пераважна без ападкаў. Толькі ў выхадныя дні надвор'е пачне мяняцца. У нядзелю малаактыўны атмасферны фронт, які стане перамяшчацца праз тэрыторыю краіны, выкліча месцамі кароткачасовыя дажджы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Заўтра будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да плюс 10 градусаў, месцамі дасягне плюс 11—12 градусаў. Удзень у асноўным будзе 11—17 цяпла, па поўдні краіны паветра прагрэецца да 18—20 градусаў. Не чакаецца ападкаў і ў чацвер. У гэты дзень тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 градусаў вышэй за нуль, месцамі — 8—10 цяпла. Удзень будзе ад плюс 11 да 18 градусаў, па поўдні — плюс 19—22 градусы.

У пятніцу і суботу будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі па поўначы Беларусі магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе ад плюс 11 да 18 градусаў, у паўднёвых раёнах — да 21 цяпла.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у нядзелю, 27 кастрычніка, малаактыўны франтальны раздзел выкліча месцамі, пераважна па паўночнай палове краіны, кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 цяпла. Удзень будзе ўжо крыху халадней — 9—16 цяпла, па поўдні — да плюс 20.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПРЫГАЖЭЙ, СТАЛІЦА!

## У Мінску прайшлі акцыі па азеляненні тэрыторыі

**У мінулую суботу ў межах глабальнай экалагічнай кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму!», а таксама асенняга месячніка па добраўпарадкаванні і азеляненні супрацоўнікі Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя займаліся пасадкай дрэў адразу ў двух раёнах сталіцы.**

Разам з вучнямі гімназіі № 19 Мінска і спецыялістамі УП «Зелянбуд Фрунзенскага раёна Мінска» супрацоўнікі камітэта на чале з намеснікам старшыні Алегам Бузо высадзілі 30 дрэў у мікраараёне Каменная горка.

На тэрыторыі каля гасцініцы «Пекін» дзякуючы эколагам і спецыялістам УП «Зелянбуд Ленінскага раёна Мінска» таксама з'явіліся 30 саджанцаў.

Акцыі па пасадцы зялёных насаджэнняў пад эгідай Мінпрыроды не заканчваюцца і будуць праходзіць кожную суботу да 2 лістапада ўключна ў буйных населеных пунктах ва ўсіх абласцях краіны. Далучыцца да кампаніі можа кожны ахвотны. Дастаткова пасадзіць дрэва альбо куст у сваім двары ці мікрараёне.

Яшчэ вясной 2019 года для мінчан запрацаваў сайт «Зялёны двор разам!» (http://gorod.gov.by/ozelenenie/minsk), дзе гараджане могуць запісацца на азеляненне сваіх прыдамавых тэрыторый, а таксама пакінуць прапановы па пасадках дрэў і кустоў. Спецыялісты ЖКГ дапамогуць добраахвотнікам арганізаваць работу, па магчымасці выбраць пасадачны матэрыял, дадуць неабходны інвентар.

Глабальная экалагічная кампанія «Добраўпарадкуем малую радзіму», якую ініцыявала Мінпрыроды, праходзіць у нашай краіне ўжо другі год. Яна ўключана ў Рэспубліканскую праграму мерапрыемстваў на 2018—2020 гады пад знакам Года малой радзімы.

Яе мэта — унёсак кожнага ў добраўпарадкаванне раёна, жылога двара, найбліжэйшага парку ці сквера, вадаёма. Гэта можа быць пасадка дрэў ці хмызнякоў, фарбаванне агароджы і лавак, прыборка смецця.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Як нас дураць

# Варажбітка раскінула карты...

**У жыхаркі горада Гродна ўзніклі пэўныя праблемы ў жыцці. З кім не бывае? Вырашыць іх простымі зямнымі спосабамі ніяк не атрымоўвалася, таму жанчына вырашыла звярнуцца да дапамогі вышэйшых сіл. На прасторах глабальнай камп'ютарнай сеткі яна натрапіла на заклік звяртацца ў цяжкіх жыццёвых абставінах да «бабулі Дар'і» і звязалася з ёй.**

Варажбітка зазірнула ў крыштальны шар, раскінула карты і ўгледзела, што на жыхарцы абласнога цэнтра ляжаць псута і сурокі. Вырашыць гэтую праблему аказалася нескладана, але для выпраўлення сітуацыі вышэйшым сілам спатрэбіліся... цалкам зямныя грошы. У выніку жыхарка Гродна пераявіла сваёй памочніцы 1618 долараў ЗША. Варажбітка, у сваю чаргу, аптымістычна паабяцала, што праз два тыдні сітуацыя зменіцца ў самы лепшы бок.

Прайшлі два тыдні, аднак гродзенка не адчула ніякіх змен да лепшага. Яна звязалася з бабкай, і тая сцвярджала, што трэба яшчэ крыху пачакаць, а затым — і зусім перастала выходзіць на сувязь. Як вынік, пасля няўдалых спробаў зносін з вышэйшымі сіламі пацярпелая звярнулася па дапамогу ў Ленінскі РАУС Гродна. На гэты момант удалося ўстанавіць, што жыхарка горада пераводзіла свае грошы на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі. Сышчыкі праводзяць комплекс неабходных аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў.

За падобнае злачынства прадугледжана крымінальная адказнасць па частцы 1 артыкула 209 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — «Махлярства», нагадвае **Аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Праваахоўнікі нагадваюць уражлівым грамадзянам, што падобнага роду выпадкі не адзінкавыя. Як паказвае практыка, калі складана знайсці простае выйсце з сітуацыі, людзі пачынаюць шукаць альтэрнатыўныя спосабы і менавіта тады натыкаюцца на такіх вось «лекараў душы». Вось толькі ў такіх выпадках замест адной праблемы з'яўляюцца яшчэ некалькі. Таму варта задумацца, каму а самае галоўнае — за што вы даяце свае зберажэнні.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

Трагедыя

# Бацька-забойца

## У Зэльвенскай раённай бальніцы памерла чатырохгадовая дзяўчынка, якую збіў бацька

**Двое сутак дзіця знаходзілася ў рэанімацыі ў непрытомным стане. Дзяўчынка паступіла ў бальніцу ў стане клінічнай смерці, амаль не дыхала. Яе адразу ж падключылі да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, але выратаваць малую так і не ўдалося.**

Хуткую дапамогу ў пятніцу вечарам выклікаў бацька, які, як высветлілася, да гэтага тузаў дачку, біў рукамі і нагамі, некалькі разоў штурхануў на тахту і сцяну. Пасля таго як малая страціла прытомнасць, мужчына выклікаў хуткую дапамогу. Медыкі канстатавалі мноства сінякоў і сур'ёзную чэрапна-мазгавую траўму. Толькі пасля рэанімацыйных дзеянняў у бальніцы ўдалося «запусціць» сэрца, бо дзяўчынка нават не дыхала. Быў падключаны апарат штучнай вентыляцыі лёгкіх, які падтрымаў яе жыццё ўсяго на двое сутак. У нядзелю яе не стала.

Па гэтым факце ў адносінах 25-гадовага бацькі Зэльвенскім раённым аддзелам Следчага камітэта ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле «Замах на забойства заведама малалетняй асобы». Мужчына затрыманы і ўзяты пад варту.

Як паведамілі ў прэс-службе Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці, следчыя мерапрыемствы прайшлі на месцы злачынства з удзелам затрыманага. Таксама вядзецца апытванне сведкаў, прызначаны шэраг экспертаў. Вядуцца следчыя і іншыя працэсуальныя дзеянні.

Да гэтага часу пацярпелая разам са сваёй трохгадовай сястрой знаходзілася на ўтрыманні бацькі, бо іх маці была пазбаўлена бацькоўскіх правоў. Неадназова дзяцей забіралі з сям'і, якая знаходзілася ў сацыяльна небяспечным стане. Год таму іх перадалі бацьку, які пражываў са сваёй сужыцелькай. Цяпер малодшую сястру забралі органы апекі, ёй дадзены статус дзіцяці, якое засталося без апекі бацькоў. На яе целе медыкі таксама выявілі цялесныя пашкоджанні. Трохгадовая дзяўчынка нейкі час будзе знаходзіцца ў Зэльвенскім сацыяльна-педагагічным цэнтры.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### БУДЗЕ НОВЫ ЛЕС!

**Лес, які прыйшлося высекчы з-за нашэсця караеда, на Гомельшчыне засаджвалі новымі дрэўцамі. У рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Чысты лес», якая ў рэгіёне супала з суботнікам абласнога маштабу, выйшла больш за 300 тысяч жыхароў. Сярод іх быў і старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**

Спачатку ён пазнаёміўся з гадавальнікам Гомельскага вопытнага лясгаса «Сасноўка», а потым непасрэдна ўдзельнічаў у пасадцы дрэў. Разам з паплечнікамі губернатар працаваў у раёне вёскі Цыкуны Гомельскага раёна — на ўчастку Макееўскага лясніцтва. Працоўны дэсант аблвыканкама за дзень высадзіў больш за 7,5 тысячы хвой і бяроз на дзялянцы ў 1,3 гектара.

— Цяперашняе маштабнае мерапрыемства дапаможа зрабіць чысцейшымі і прыгажэйшымі нашы гарады і вёскі, лясы і двары, — адзначыў Генадзь Салавей. — Напрыклад, толькі за адзін тыдзень мы пасадзілі больш 35,6 тысячы дрэў: звыш 70 % у гарадах, каля 30 % — у сельскіх населеных пунктах.

Сотні маладых дрэў з'явілася таксама ў горадзе над Сожам і райцэнтрах. Гэтай восенню ў населеных пунктах Гомельскага рэгіёна маюць намер высадзіць больш за 45,5 тысячы дрэў. Адначасова насельніцтва розных раёнаў займалася ўборкай лістоты, навядзеннем парадку на розных тэрыторыях, дзіцячых пляцоўках, ачысткай ад смецця дарог, трас і лесапалос.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ЗАГІНУЛІ СЫН І МАЦІ

**Трагедыя адбылася ў выніку пажару ў пасёлку Антопаль Драгічынскага раёна.**

Адна з кватэр трохкватэрнага аднапавярховага дома загарэлася ў гадзіну ночы. Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ,** пажарна-выратавальнае падраздзяленне прыбыло да месца выкліку, калі ўнутры кватэра гарэла. Ратавальнікі вынеслі з агню людзей. Але медыкі, якія прыбылі, пасля рэанімацыйных мерапрыемстваў канстатавалі смерць 79-гадовай гаспадыні кватэры і яе 44-гадовага сына. Паведамляецца, што жыльцы суседніх кватэр пакінулі жыллё самастойна. Пацярпела толькі гэтая кватэра. Прычыны пажару пакуль не называюцца.

У Антопальскім сельскім Савеце сям'ю ахарактарызавалі як станоўчую. Пенсіянерка і яе сын, які працаваў на чыгунцы, былі на добрым рахунку ў аднавяскоўцаў. У вёсцы перажываюць трагедыю і гавораць пра магчымае кароткае замыканне праводкі. А вось пажарныя падкрэсліваюць, што кватэра не была аснашчана апавяшчальнікам, які мог бы на некалькі хвілін раней разбудзіць гаспадароў. І тыя хвіліны сталі б ратавальнымі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### УКРАЎ АЎТАМАБІЛЬ,

каб зрабіць уражанне на дзяўчыну

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Маскоўскага РУУС Мінска затрыманы 30-гадовы гараджанін, які скраў аўтамабіль БМВ-525 у свайго знаёмага.**

Напярэдадні пацярпелы, вярнуўшыся з работы, прыпаркаваў аўто каля дома, а ключы, як звычайна, пакінуў на паліцы ў пярэднім пакоі. Увечары запрасіў у госці аднакласніка, якога не бачыў восем гадоў. Даўні знаёмы прыйшоў са сваёй сужыцелькай. Пасля сумеснага распівання спіртных напояў маладая пара пасварылася, пасля чаго дзяўчына пайшла. Знаёмаму прапанавалі застацца пераначаваць. Прачнуўшыся раніцай, пацярпелы выявіў адсутнасць сябра, а разам з ім і сваёй машыны.

Аператыўнікі высветлілі, што мужчына вырашыў скарыстацца выпадкам і з'ездзіць на чужым аўто да дзяўчыны, каб вырашыць канфлікт. Рухаючыся па вуліцы, мінчанін урэзаўся ў аўтамабіль і ўцёк з месца здарэння, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Устаноўлена, што раней ён быў судзімы за ўгон і крадзеж. Транспартны сродак быў вернуты ўладальніку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### МУЖЧЫНЫ, БЕРАЖЫЦЕ СЯБЕ!

**У Брэсце за мінулыя выхадныя зафіксавана два трагічныя выпадкі, якія звязаны з мужчынамі розных узростаў.**

У суботу з кватэры на дзясятым паверсе дома па вуліцы Сальнікава выпаў 49-гадовы мужчына. Вышыня падзення не пакінула чалавеку шанцаў на жыццё. Папярэдні агляд цела спецыялістамі не выявіў прыкмет прымянення гвалту. Ёсць нагода дапускаць, што гэта быў спосаб звесці рахункі з жыццём. І калі ў гэтым выпадку ўсё ж застаецца некатарая верагоднасць няшчаснага здарэння, то ў другім спецыялісты амаль не сумняваюцца.

18-гадовы хлопец скакаў з моста ў раёне чыгуначнага вакзала з жаданнем памерці. Але ён упаў не на рэйкі, таму застаўся жывы і з траўмамі быў дастаўлены ў бальніцу. СК вядзе праверку па абодвух выпадках. Прызначаны ўсе неабходныя экспертызы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Экспрэс-навіны

### БЕЛАРУСКІ ПОГЛЯД НА БЯСПЕКУ

**У нядзелю пачаўся афіцыйны візіт міністра абароны Андрэя Раўкова ў Кітай. На працягу чатырох дзён там праходзіць 9-ы Пекінскі форум па пытаннях бяспекі «Сяншань».**



Фота БелТА.

Плануецца, што кіраўнік абароннага ведамства выступіць з дакладам, тэмай якога стане беларускі погляд на міжнародныя сістэмы кантролю над узбраеннямі і глабальную бяспеку.

Таксама запланавана сустрэча з міністрам абароны Кітая Вэй Фэнхэ. Яна будзе прысвечана пытанням міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, а таксама развіццю стасункаў ведамстваў двух краін.

### СЛУЖБУ Ў АРМІІ ЗАЛІЧАЦЬ У СТРАХАВЫ СТАЖ

**Увядзення гэтай нормы доўгі час дабівалася Міністэрства абароны.**



Фота БелТА.

І вось на мінулых выхадных прэс-служба ведамства паведаміла, што ўрад прапрацаваў комплекс мер, скіраваных на павышэнне статусу юнакоў, прызваных на тэрміновую ваенную службу. Гэты пакет ужо прадстаўлены Прэзідэнту і быў ім ухвалены. Па яго даручэнні пачата падрыхтоўка праектаў адпаведных прававых актаў па рэалізацыі прапаноў. Частка з іх, у тым ліку і тыя, якія датычацца страхавога стажу, будзе ўнесена вельмі хутка — да 1 снежня.

Паралельна прапрацоўваецца яшчэ шэраг мер, якія прадугледжваюць ільготы ваеннаслужачым тэрміновай службы ў сферы адукацыі, аховы здароўя, жыллёвага забеспячэння.

Нагадаем, супраць уключэння часу тэрміновай службы ў страхавы стаж раней выступалі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, а таксама Міністэрства фінансаў. Іншыя зацікаўленыя дзяржаўныя органы прытрымліваліся супрацьлеглага меркавання. У сваю чаргу, **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар МАРТЫНАЎ** адзначаў у інтэрв'ю «Звяздзе», што да канца года кансэнсус па гэтым пытанні мяркуецца знайсці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ЗАЎЖДЫ НА ЛІНІІ!

## Войскі сувязі адзначылі 100-я ўгодкі са дня стварэння

**БЕЗ каардынацыі дзейнасці войскаў няма агульнага выніку. «Звязацць» жа іх у адзіны «арганізм» можа толькі якасная работа ваенных сувязістаў. А гэта залежыць ад многіх фактараў, сярод якіх — надзейнасць тэхнікі і адказнасць асабовага складу. За сто гадоў войскі сувязі прайшлі вялікі шлях. Нават і не верыцца, гледзячы на сучасную магутную тэхніку, што калісьці ўсё пачыналася з адбівання кропак і працяжнікаў з дапамогай просценькага апарата Морзе.**

Напярэдадні свята **начальнік сувязі Узброеных Сіл Алег МІШЧАНКА** даў невялікі брыфінг у незвычайным месцы — мабільным пункце кіравання, які ў гэтыя дні быў дыслакаваны на тэрыторыі 86-й брыгады сувязі, што знаходзіцца пад Мінскам. Звычайна гэты аб'ект закрыты ад пабочных асоб.

— Гэты пункт разгортваецца на працягу некалькіх хвілін у любой кропцы, — расказвае Алег Мішчанка. — Можна нават сказаць, што мы ў самым цэнтры сістэмы сувязі Узброеных Сіл. Усе падначаленыя структуры знаходзяцца на закрытай відэаканферэнцсувязі пастаянна, 24 гадзіны ў суткі. Мы можам кантраляваць работу ва ўсіх дыяпазонах частот з вывадам сюды і пры неабходнасці прымаць рашэнні. Важны момант — тое, што мы ўсё бачым у рэжыме рэальнага часу, у тым ліку і дзякуючы станцыям спадарожнікавай сувязі. Плынь інфармацыі будзе дастаўлена ў поўным аб'ёме і зашыфравана.

Да канца года да нас працягне паступаць найноўшая тэхніка — як для доследнай эксплуатацыі, так і ўзоры, якія ўжо паступілі на серыйную вытворчасць і прыняты на ўзбраенне. Акрамя прадпрыемстваў Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, свае распрацоўкі актыўна вядзём і мы. Створаны цэхі па рамонце і мадэрнізацыі сродкаў сувязі, ёсць уласнае канструктарскае бюро, свае распрацоўшчыкі і выканаўцы. На буйных манеўрах мы ўжо выкарыстоўвалі гэтыя сродкі, у тым ліку і гэты пункт. І яны дэманструюць сваю эфектыўнасць.

— Войскі сувязі пастаянна развіваюцца, удасканальваюцца сістэмы перадачы, — кажа **камандзір 86-й брыгады сувязі Сяргей ШЧАРБАКОЎ**. — Увесь час паступаюць новыя ўзоры тэхнікі, што накладвае дадатковую адказнасць пры асваенні і эксплуатацыі. Але за апошнія 10 гадоў яны не проста зрабілі крок наперад. Увесь парк сувязі абнавіўся, войскі пераўзброіліся на сучасныя лічбавыя сродкі сувязі, незалежна ад таго — радыёрэлейныя яны, праводныя або маюць дачыненне да засакрэчвання. Напрыклад, нясучая частата на адной з радыёстанцый пераключаецца за секунду 200 разоў, і ніякія сродкі барацьбы эфектыўна запеленгаваць і падавіць такую перадачу не ў стане.

## «Інструкцыя да тэлефонаў была спачатку на англійскай мове»

**Прафесійнае свята адзначылі і вайскоўцы 56-га палка сувязі. Яны зладзілі Дзень адчыненых дзвярэй, падчас якога паказвалі ўсім ахвотным ваенную тэхніку, музейную экспазіцыю і частавалі смачнай кашай.**



Пра радыёрэлейную станцыю «Цытрус» апавядае **камандзір узвода радыёрэлейных станцый Уладзімір КУХАРАЎ.**

— З яе дапамогай мы можам перадаваць інфармацыю па валаконна-аптычным кабелі, радыёрэлейным ствале. Трансляваць голас, відэа, даныя, у тым ліку і з выкарыстаннем шырокапалоснага доступу. Яна працуе ў некалькіх дыяпазонах. А экіпаж складае ўсяго пяць чалавек.

**— Ці складана навучыцца на ёй працаваць?**

— Мінімальныя веды, канешне, пажаданы. Але сама станцыя, нягледзячы на ўсе свае «навароты», дастаткова простая. З асабістага вопыту скажу, што за некалькі тыдняў навучыць салдата можна цалкам упэўнена. А далей усё залежыць ад яго.

**— Наколькі работа сувязіста адрозніваецца ад таго, што мы бачым у старым кіно?**

— Падабенства захавалася хіба толькі ў тым, што салдат сядзіць у навушніках. Цяпер аналагавая сістэма перадачы інфармацыі сышла ў мінулае, мы працуем з «лічбай». Адпаведна, зараз апаратур карыстаецца камп'ютарам. Разам з тым мы можам выканаць і старую камутацыю пры дапамозе правадоў, але неабходнасці ў гэтым усё меней. Ды і наогул, аналагавыя радыёстанцыі вымагалі большага аб'ёму работы, а ўсё магчымасцяў было меней. Напрыклад, пра тое, каб радыёстанцыя працавала ў сотнях каналаў сувязі, мы раней маглі толькі марыць. Цяпер жа гэта рэальнасць. Не кажучы ўжо аб тым, што мы можам спакойна трансляваць зашыфраваныя даныя. Лічбавы код складзены так, што ўзламаць яго амаль немагчыма. Для «чужых» слухачоў у эфіры будуць ісці толькі перашкоды. Акрамя таго, гэтую апаратную мы можам разгарнуць за паўгадзіны. На стары аналагавы варыянт патрабавалася каля дзвюх гадзін.

**Старшы механік Станіслаў ГУНІЧ**, які абслугоўвае іншую радыёрэлейную станцыю, — кантрактнік. Ён быў прызваны ў войска ў 2016 годзе на 18 месяцаў. Хоць да гэтага ніякага дачынення да сувязі не меў, але таямніца радыёэфіру спакусіла яго працягваць службу ўжо ў статусе прафесійнага вайскоўца.

— Скажам так, з нуля мне было складана ўсё асвойваць. Пакуль вывучыў усе асаблівасці, прайшло некалькі месяцаў. Але тэарэтычныя заняткі падмацоўваліся практыкай на палігонах падчас палявых выхадаў, і таму я паступова ўцягнуўся ў гэты рытм. За паўтара года вывучыў радыёстанцыю да дробязяў. Мне пашанцавала, што не давялося перавучвацца са старога аналагавага абсталявання на сучаснае лічбавае. І калі вам нехта скажа, што сувязісты толькі і робяць, што перадаюць у эфір «марзянку» і змотваюць кабель у бухту, — не верце. Наша работа нашмат цікавейшая. Напрыклад, падчас парада я каардынаваў пралёт авіяцыі...

Сто гадоў развіцця войскаў сувязі — гэта перш за ўсё гісторыя. Пры 56-м палку сфарміраваны спецыяльны музей. Пра яго найбольш цікавыя экспанаты расказвае **старшы радыётэлеграфіст Любоў ПАПОВА *(на фота)*.**

— Напрыклад, увагі заслугоўвае друкарская машынка 1933 года. Яна выпушчана ў Германіі канцэрнам Rheinmetall. Але да падпісання Версальскага мірнага дагавора гэты канцэрн вырабляў зброю. Умовы перамір'я забаранілі яму гэта рабіць, і заводы пераключыліся на выпуск друкарскіх машынак. З прыходам да ўлады Гітлера вытворчасць прадметаў грамадзянскага побыту была згорнута, і з канвеера зноў пачала сыходзіць зброя. Да нас жа гэтая машынка трапіла ў ліку рэпарацый.

Яшчэ адзін цікавы экспанат з ваенных часоў — амерыканскі палявы тэлефон. У СССР ён пастаўляўся па ленд-лізе. Зручнасць гэтага тэлефона ў тым, што на корпус нанесена яго электрычная схема. Але... па чыімсьці недаглядзе першыя партыі тэлефона пастаўляліся так, як і выпускаліся, — са схемай на англійскай мове. Здавалася б, і што ў гэтым такога, але... у даваенны час у савецкіх школах масава вывучалася якраз-такі нямецкая мова. І сувязістам працаваць з англамоўным варыянтам было вельмі нязручна.

Экспанаты трапляюць у музей рознымі шляхамі. Сёе-тое перадаецца ў якасці спісанай тэхнікі. Але і ваенныя пошукавікі таксама знаходзяць вельмі цікавыя рэчы.

— Вось два правады, — працягвае Любоў Папова. — Іх знайшлі падчас адной з экспедыцый. Бачыце, яны адрозніваюцца ізаляцыяй? Той, які выглядае як новы, — гэта дрот нямецкай вытворчасці. Сакрэт просты: яшчэ ў тыя гады ў якасці ізалятары немцы выкарыстоўвалі пластык. А вось у СССР такой тэхналогіі 80 гадоў таму не было, і даводзілася карыстацца брызентам, які па даўгавечнасці істотна саступае пластыку. Усё гэта, адпаведна, уплывала на якасць падключэння. Вось тым і тлумачыцца тое, чаму нашы сувязісты падчас вайны часта палявалі на катушкі з нямецкім провадам.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**





Беларусь памятае

# «На дзвюх дзяўчынак, я думаю, ніхто не зверне ўвагі...»

**Усё менш застаецца жывых сведкаў Вялікай Айчыннай вайны. І таму ўспаміны тых, хто і цяпер можа расказаць пра падзеі ліхалецця 40-х гадоў, становяцца ўсё больш каштоўнымі. Малая радзіма нашага даўняга сябра з Вялікай Бераставіцы Міхаіла МАСКАЛЬЧУКА — Любанскі раён. Гэта мясціны з багатым партызанскім мінулым. Міхаіл Васілевіч ужо апавядаў пра спецаперацыю, падчас якой партызаны здабылі дэфіцытную соль. Цяпер жа ў працяг тэмы — дзве гісторыі.**

## НЕБЯСПЕЧНАЯ ПАДАРОЖЖА ПА ХЛЕБ

25 лістапада 2015 года ў «Звяздзе» ў праекце «Плацдарм» было надрукавана апавяданне «Тут гучалі галасы». Гаворка ў ім ішла пра маю першую вясковую школу, якая размяшчалася 60 гадоў таму ў простай сялянскай хаце жыхаркі вёскі Камуна Любанскага раёна Раісы Кур'ян.

> **Угледзеўшы немцаў або паліцаяў, мы з Лідай у патрэбныя хаты не заходзілі. Чакалі, пакуль ворагі пакінуць вёску. Асабліва мы баяліся паліцаяў, бо тыя маглі пазнаць нас. Прычым яны добра ведалі, што нашы маці ў партызанах, а таты ваююць на фронце. Канец быў бы адзін — гестапа.**

І вось у пачатку гэтага года, пераадолеўшы амаль 500 кіламетраў, я зноў на сваёй малой радзіме. Пад'язджаю да звычайнага цаглянага дома, акуратна пабеленага клапатлівай гаспадыняй. Тут і жыве Раіса Мікітаўна. Убачыўшы мяне, цётка Рая замітусілася, пачала збіраць стол. Яна засталася такой жа гасціннай гаспадыняй, якой была заўсёды.

Я вырашыў распытаць Раісу Мікітаўну, што яна памятае пра вайну. А аказалася, што цётка Рая сама была юнай партызанкай у атрадзе і выконвала разам са сваёй малодшай сяброўкай Лідай далёка не дзіцячыя заданні камандавання партызанскага атрада, часта рызыкуючы сваім жыццём.

Далей апавядае Раіса Мікітаўна.

— Нарадзілася я ў далёкім 1931 годзе. Мой тата, Кузняцоў Мікіта Арсеньевіч, былы чырвонаармеец, прыехаў у канцы 20-х гадоў асушаць Мар'інскія балоты. Тут пазнаёміўся з маёй мамай Аляксандрай Спірыдонаўнай, яны пажаніліся. Калі мне быў годзік, то ў нашу вёску прыехаў у канцы красавіка 1932 года Янка Купала, які тое, што ў нас пабачыў, апісаў у паэме «Над ракой Арэсай». Паэт любіў гутарыць з жыхарамі вёскі, у тым ліку і з маім бацькам.

У 1940 годзе тата разам з маміным братам Паўлам Спірыдонавічам удзельнічаў у фінскай вайне. Пайшлі ваяваць і ў 1941-м.

17 ліпеня фашысты ўварваліся ў нашу вёску і ў той жа дзень разрабавалі і спалілі яе, забілі двух жыхароў.

Першую зіму мы з мамай перажылі ў вясковым клубе, які карнікі не знішчылі. А ў 1942-м, калі навокал масава пачалі з'яўляцца партызанскія атрады, мая маці пайшла ў адзін з іх, які ўваходзіў у 25-ю брыгаду імя Панцеляймона Панамарэнкі. У гэтай брыгадзе ўжо ваяваў мамін малодшы брат Фёдар Спірыдонавіч. Спачатку мама была сувязная ў атрадзе разам з яшчэ адной жыхаркай вёскі Камуна Аленай Шыкуновай. Затым жанчын перавялі ў гаспадарчы ўзвод, бо яны ўмелі добра гатаваць. У маміным распараджэнні быў конь з возам, на якім вазілі посуд і прадукты, бо атрад увесь час перамяшчаўся. Мне было 11 гадоў, я дапамагала матулі гатаваць ежу для партызан, насіла дровы, распальвала кацёл, абірала бульбу.

У Алены Шыкуновай былі дзве дачкі — Ліда і зусім маленькая Ірачка. Мы з Лідай сябравалі, дапамагалі сваім матулям. Я была баявая дзяўчынка і хацела ваяваць, біць фашыстаў, як мой тата на фронце, а не сядзець на кухні. Я так надакучыла маці, што тая адвяла мяне да камандзіра нашага атрада.

— Што мне з ёй рабіць, хоча ваяваць, — стала гаварыць маці, моцна трымаючы мяне за руку.

— Добра, няхай ваюе. Вінтоўку мы ёй не дадзім. Яна цяжкая для яе, а вось хлеб будзе збіраць па хатах для партызан. Ну што, згодная, Раечка? — усміхнуўся камандзір.

— Ну канешне, згодная! — весела адказала я. — Толькі дазвольце мне, таварыш камандзір, выконваць заданні разам з маёй найлепшай сяброўкай Лідай, яна ўжо амаль дарослая!

— І колькі ж гадоў тваёй амаль дарослай сяброўцы? — спытаў камандзір.



**Пераход праз балота партызан 25-й брыгады імя П. Панамарэнкі. Недзе ў гэтым страі народных мсціўцаў знаходзяцца маленькія партызанкі Рая і Ліда.**

— Ужо многа! Хутка сем! — адказала я камісару атрада.

— Аляксандра Спірыдонаўна, тут такая сітуацыя склалася. Нашы хлопцы збіраюць па вёсках у жыхароў хлеб, які яны пякуць для нас. Але з кожным днём рабіць гэта ўсё цяжэй. Немцы і паліцаі хапаюць усіх падазроных і адпраўляюць у гестапа, — прамовіў камандзір, падышоўшы да мамы. — З гестапа і з СД жывымі не вяртаюцца! А на дзвюх дзяўчынак, я думаю, ніхто не зверне ўвагі. Ну ідуць дзве жабрачкі, пабіраюцца... Ну а вы з Аленай Шыкуновай павінны на гэта даць згоду як маці дзяўчынак. Тым больш, Спірыдонаўна, што ў вас Раечка — адзіная дачка!

— Я даю згоду, думаю, згодная будзе і Алена! — прамовіла мая маці.

Так мы з Лідай сталі выконваць заданні камандавання нашага атрада. Звычайна нашы разведчыкі паказвалі нам план вёскі, намаляваны на аркушыку са школьнага сшытка. Там былі пазначаны крыжыкам хаты, куды мы з Лідай павінны былі заходзіць па хлеб. Затым у пэўнай хаце або ў спецыяльнай схованцы ў лесе мы пакідалі хлеб і ляснымі сцяжынкамі дабіраліся ў свой атрад. Хлеб ноччу ўжо без нас забіралі партызаны. Гэта была вельмі небяспечная работа. Разведчыкі прымушалі нас запамінаць размяшчэнне патрэбных хат у вёсках. Вучылі арыентавацца ў лесе ўдзень і ўначы, правільна распальваць вогнішча, разбірацца ў зброі — як нашай, так і нямецкай. А самае галоўнае — умець захоўваць таямніцу. Ніхто ў атрадзе не павінен быў ведаць, куды і навошта мы ідзем. Фашысты пад выглядам жыхароў і нашых палонных салдат стараліся заслаць у атрад сваіх людзей, і тыя перадавалі інфармацыю ў СД і гестапа.

Угледзеўшы немцаў або паліцаяў, мы з Лідай у патрэбныя хаты не заходзілі. Чакалі, пакуль ворагі пакінуць вёску. Асабліва мы баяліся паліцаяў, бо тыя маглі пазнаць нас. Прычым яны добра ведалі, што нашы маці ў партызанах, а таты ваююць на фронце. Канец быў бы адзін — гестапа.

Вельмі часта нас абшуквалі, ператрасалі палатняныя торбы. На гэты выпадак у нас заўсёды былі з сабой некалькі яек, малако, па кавалачку сала. Усе прадукты харчавання карнікі адразу забіралі і яшчэ задаволеныя крычалі: «О, гут, яйкі, млеко, шпік, кіндэр партызанкі... клоп нету?»

Затым настаўлялі на нас аўтаматы і рагаталі: «Пух, пух, кляйнэ партызанкі». Пасля давалі кухталя ў плечы і праганялі.

Хадзілі мы з Лідай па хлеб у вёскі Жыткавіцкага, Любанскага, Петрыкаўскага раёнаў. Мы не толькі збіралі хлеб, але яшчэ і запаміналі, якія войскі знаходзяцца ў вёсках, якое ў іх узбраенне, дзе знаходзяцца нямецкія пасты і агнявыя пункты. Пра ўсё, што бачылі, мы з Лідай дакладвалі камандзіру нашага атрада, калі вярталіся з чарговага задання.

## ВЫРАТАВАЛЬНІК НА ЧОРНЫМ ЖАРАБЦЫ

— Мой дзядзька, мамін брат Фёдар Спірыдонавіч, быў сувязны ў нашай брыгадзе, — працягвае Раіса Кур'ян. — Ездзіў вярхом на чорным жарабцы Орліку, быў узброены важкім маўзерам у драўлянай кабуры, на грудзях насіў аўтамат ППШ і палявы бінокль. Дзядзька Фёдар перадаваў шматлікія данясенні ў атрады нашай 25-й брыгады. І вось у пачатку сакавіка 1944 года ён здзейсніў сапраўдны подзвіг, але з-за сваёй сціпласці амаль нікому пра гэта не расказваў.

У раёне вёскі Альбінск і партызанскага аэрадрома Зыслаў частка партызанскіх брыгад Палескага злучэння трапіла ў акружэнне. Фашысцкае камандаванне разумела, якую пагрозу ўяўляюць партызаны, што дзейнічалі ў тыле іх арміі, і накіравала супраць злучэння рэгулярныя часці, знятыя з фронту, а таксама тыя, што знаходзіліся ў рэзерве. Былі задзейнічаны авіяцыя, ахоўныя батальёны, дапаможныя сілы паліцыі. Пачаліся цяжкія баі партызан з захопнікамі.

— Пад раніцу, калі яшчэ было цёмна, Фёдар, выканаўшы чарговае заданне, вярнуўся ў штаб сваёй 25-й брыгады, — згадвае Раіса Кур'ян. — Непадалёк ад ракі Арэсы ён сустрэў невялікую групу партызан і мірных жыхароў з дзецьмі, якую праследавалі карнікі з сабакамі і паліцаі. Наперадзе было шырокае поле, за ім рака, якая моцна разлілася. Трэба было тэрмінова пераправіцца на правы бераг, інакш бы ўсе загінулі. Як на бяду, вялікі плыт гойдаўся пад парывамі ветру на процілеглым беразе, і яго трэба было як мага хутчэй перагнаць праз раку. А якая там цеплыня вады ў сакавіку — па ёй сям-там плылі кавалкі лёду.

Той плыт не кожны мог прыгнаць нават улетку. Адлегласць вялікая, плыт важкі, а тут яшчэ і халадэча. Ды і плыўцоў сярод партызан таксама не было. Стварылася крытычная сітуацыя. Жанчыны, прыціснуўшы дзяцей да грудзей, пачалі маліцца. У лесе чуліся стрэлы, брэх аўчарак...

— Цётка Рая, з вашага дазволу я працягну аповед далей сам са слоў майго бацькі, — папрасіў я. — Мой тата таксама быў у гэтай групе партызан.

...І тут з густога туману з'явіўся партызан на чорным жарабцы. «Хутка ўсім спыніць паніку, карнікі выйдуць з лесу, яны за некалькі сотнь метраў ад поля», — прагаварыў хлопец, злазячы з каня. Ён стаў хутка раздзявацца, затым смела рушыў у ледзяную ваду. Праз некалькі хвілін плыт быў ужо на левым беразе.

— Ёсць у каго спірт? — пракрычаў партызан, размінаючы рукі.

— Вось вазьміце самагонку, пяршак! — нейкая дзяўчына падала партызану салдацкую фляжку, сарамліва адварочваючыся.

— Хутчэй усе на плот, у першую чаргу жанчыны з дзецьмі!» — загадаў хлопец, абціраючы голае цела самагонкай.

Ён пераправіўся з апошняй партыяй.

«А цяпер хутка ўсе да лесу, пакуль добра не развіднела. На полі вы ўсе загінеце пад агнём кулямётаў, — пракрычаў хлопец. — А я іх пастараюся затрымаць, пакуль дабяжыце да лесу!»

Фёдар папрасіў у нас нямецкі ручны кулямёт, нам аддаў свой аўтамат. Затым заправіў стужку з патронамі, узвёў затвор.



**Лідзія Савік. Тая самая сямігадовая дзяўчынка, з якой хадзіла Рая на заданні. Яе тата, Адам Пятровіч, — родны брат Пракопа Адзярыхі, якога згадваў у паэме «Над ракой Арэсай» Янка Купала.**



**Раіса Кур'ян.**

— Орлік, спаць! — крыкнуў хлопец свайму каню.

Жарабец паслухмяна лёг у глыбокую лагчыну пад куст вербалозу. Ужо зусім развіднела. Карнікі ўжо выходзілі з лесу, падбягалі да ракі. Убачыўшы нас, сталі страляць з кулямётаў, фашысцкія кулі збівалі галінкі дрэў. Мы, пахапаўшы дзяцей на рукі, забягалі ў ратавальны лес.

Карнікі сталі ўстанаўліваць па беразе мінамёты, і тут запрацаваў партызанскі кулямёт. Немцы і іх памагатыя, разгубіўшыся, пабеглі назад у лес. Але не ўсе дабеглі...

Пасля вызвалення Фёдар Харанка адправіўся ваяваць на фронт. Пасля Перамогі вярнуўся дадому са шматлікімі ўзнагародамі. Працаваў у Любані кінамеханікам, выхаваў з жонкай трох сыноў. Там і скончыў свой жыццёвы шлях.

А як склаўся лёс маленькай Лідачкі і яе сястры?

Лідзія Сымонаўна Савік скончыла філфак БДУ, затым аспірантуру. У 1977 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю па праблемах сучаснай беларускай літаратуры. З 1978 года працавала ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук спярша малодшым, а пасля старшым навуковым супрацоўнікам. Актыўна друкавалася на старонках рэспубліканскіх перыядычных выданняў, дзе апублікавана звыш 100 артыкулаў і рэцэнзій, 230 энцыклапедычных артыкулаў. Актыўна ўдзельнічала Лідзія Савік у працэсах беларускага нацыянальнага адраджэння, грамадскім жыцці.

Яе малодшая сястра стала вядомай опернай спявачкай, народнай артысткай Беларусі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі. Нам яна вядома як Ірына Шыкунова.

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»**
220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2019 г.

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 370 147 | 304 294 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 336 | 175 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 058 126 | 1 149 180 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 2 878 431 | 3 845 080 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 4 145 158 | 4 824 074 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 19 908 186 | 18 967 629 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 187 146 | 187 106 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 389 336 | 393 172 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 518 | 1 637 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 43 | 338 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 1 318 | 1 318 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 54 395 | 84 155 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 28 993 140 | 29 758 158 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 60 619 | 789 997 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 4 442 148 | 4 748 744 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 18 476 575 | 18 400 967 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 1 604 479 | 1 692 947 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 1 459 | 1 459 |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 226 872 | 157 721 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 24 812 152 | 25 791 835 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 2 669 093 | 2 669 093 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 386 916 | 318 600 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 182 901 | 182 875 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 942 078 | 795 755 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 4 180 988 | 3 966 323 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 28 993 140 | 29 758 158 |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 октября 2019 г.

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 1 553 079 | 1 498 166 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 652 778 | 578 163 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 900 301 | 920 003 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 361 461 | 296 657 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 121 158 | 108 726 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 240 303 | 187 931 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 276 | 209 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 892 | 1 583 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 85 364 | 124 557 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 232 | (3 246) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 287 630 | 413 889 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 34 113 | 81 831 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 546 540 | 533 204 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 44 145 | 42 903 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 383 166 | 322 872 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 56 659 | 38 870 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 326 507 | 284 002 |

И. о. Председателя Правления А. И. Поливко

Главный бухгалтер И. П. Лысоковская

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте www.belarusbank.by и в отделениях «Беларусбанка»**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

## ОАО «Нафтан» реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

| Пометка на конверте | Наименование | Инв. № | Год ввода в эксплуатацию | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|---|
| Реализация неликвидов, 21.11.2019 | Борона для гравия | 06270543 | 2007 | 110,00 | 132,00 |
| | Борона для гравия | 06270544 | 2007 | 110,00 | 132,00 |
| | А/кран КС-35774 | 13150302 | 1992 | 23 000,00 | 27 600,00 |

**Состояние удовлетворительное.**
**Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 21 ноября 2019 года с пометкой на конверте, указанной в таблице.**
**Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42.**

УНП 300042199

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4 |

Предмет аукциона: недвижимость и оборудование, бывшее в употреблении в составе:

| № Лота | Наименование | Общая площадь, год выпуска | Инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание одноквартирного жилого дома) | 209 кв. м | 730/U-16808 | **16 723,22 бел. руб.** |
| **Местонахождение лота: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Мельникова, 5** | | | | |
| **Сведения о земельном участке:** земельный участок площадью **0,2203 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | | | | |
| 2 | Здание заводоуправления | 2 935,2 кв. м | 730/С-12820 | **338 557,41 бел. руб.** |
| **Составные части и принадлежности:** подъездная дорога (инв. № 730/С-17065); ограждение (инв. № 730/С-17063); ограждение (инв. № 730/С-17062); участок канализации (инв. № 730/С-17060); ввод водопровода (инв. № 730/С-17061) | | | | |
| **Местонахождение лота: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1А** | | | | |
| **Сведения о земельном участке:** земельный участок площадью **1,0277 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания заводоуправления | | | | |
| 3 | Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание административно-хозяйственное) | 7 458 кв. м | 730/U-15754 | **1 356 163,51 бел. руб.** |
| **Местонахождение лота: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1/1** | | | | |
| **Сведения о земельном участке:** земельный участок площадью **0,3478 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения; земельный участок площадью **0,0005 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения; земельный участок площадью **0,0005 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения | | | | |
| 4 | Торговый павильон, металл. 10*4*3 м (с охранной сигнализацией) | 40 кв. м 2011 г. в. | 13001000005; 09040000082 | **9 030,68 бел. руб.** |
| **Местонахождение лота: г. Бобруйск, Минское шоссе (автостоянка возле проходной СКГШ)** | | | | |

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 29.08.2019**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **05.11.2019** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **по 04.11.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СЛОНИМСКИЙ ВОДОКАНАЛ»

| Предмет торгов, краткая характеристика | Начальная цена с учетом НДС | Сумма задатка (5 %) |
|---|---|---|
| **Лот № 1 – капитальное строение с инв. № 450/С-18838** (здание нежилое) с пристройкой и террасой, кирпичное, 2 этажа, 1953 г. п., площадью 240,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 425450100001007537 площадью 0,0988 га для обслуживания здания, право постоянного пользования (Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Советская, д. 7) | **74 005 руб. 33 коп.** | 3 700 руб. 27 коп. |
| **Лот № 2 –** аппарат отопительный газовый марки АОГВК-23,2-1, заводской номер 13292, инв. № 8121 | **408 руб. 00 коп.** | 20 руб. 40 коп. |
| **Лот № 3 –** автоматическая пожарная сигнализация на базе ПКПА-6-06, инв. № 8122 | **396 руб. 00 коп.** | 19 руб. 80 коп. |
| **Торги состоятся 22 ноября 2019 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | по 18 ноября 2019 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8 | |

Аукцион без условий. Шаг аукциона – 5 процентов. **Сведения о продавце:** ОАО «Слонимский водоканал», 231800 Гродненская обл., г. Слоним, ул. Пушкина, 120, тел. 8 (01562) 66030. **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906. **Срок заключения договора:** в течение 10 календарных дней после проведения торгов. **Условия оплаты:** в течение 10 календарных дней с момента подписания договора. Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте **www.fincentr.by**. Более подробная информация по тел. в Гродно 8 (0152) 621632.

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Чайка» (г. Гродно, пер. Виленский, д. 16) 12 ноября 2019 года

| Вид аукциона открытый | Лот № 1 |
|---|---|
| Предмет аукциона | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 8 капитальных строений (здание административное, здание склада, здание гаража – 2 шт., здание проходной – 2 шт., здание склада готовой продукции), 4 передаточных устройства (участок тепловой сети, участок водопроводной сети, участок канализационной сети, элементы благоустройства), зеленые насаждения, 2 единицы оборудования |
| Начальная цена продажи | **1 826 681,16 руб.** (с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 440100000002001136 площадью 0,7335 га |
| Месторасположение земельного участка | **Гродненская область, г. Гродно, пер. Виленский, д. 16** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел.: 8 (0152) 607302, 745502** |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования |
| Сумма задатка | **54 800,43 руб.** |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел. 720537, 720010 |
| Дата проведения аукциона | **12 ноября 2019 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 |
| Дата и время начала приема документов | 21 октября 2019 года, 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 6 ноября 2019 года, 16.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 06.11.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 40 %)

**Лот № 1: Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-66866 – Прирельсовый склад** площадью 206,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, район станции Луполово. **Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-105917 – Здание склада с подвалом** площадью 96,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Станция Луполово, 10. **Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-105918 – Здание насосной** площадью 14,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Станция Луполово, 10/2. **Сведения о земельном участке:** кадастровый номер 740100000007003975, площадь – 0,3642 га, целевое назначение – Земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений емкостного хозяйства, расположен по адресу: г. Могилев, ул. Станция Луполово, 10.

Начальная цена продажи с учетом НДС – 57 188,90 бел. руб.
Сумма задатка – 5 718,89 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона: аукцион состоится 6 ноября 2019 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесения задатка: по 05.11.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Могилевоблпищепром», УНП 700391109, 212029, г. Могилев, ул. Островского, 64

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 10.07.2019 и 21.09.2019

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел.: +375 222 72-41-14, Mogilev@ino.by. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: +37529-624-26-25; +37529 550-09-56, на сайте ino.by**

# Падатку на багацце не будзе...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі вам не даслалі плацёжку і вы не ведаеце выстаўленай сумы падатку, то можна на сваім уліковым нумары (УНП) паглядзець у асабістым кабінеце АРІП, ці выстаўлена сума да аплаты. Тут жа можна аформіць атрыманне апавяшчэнняў аб выстаўленні рахункаў на электронную пошту ці ў месенджар Viber і Telegram. Калі вы не памятаеце нумар УНП, які складаецца з 7 знакаў, то яго можна ўдакладніць у сельскім (пасялковым) савеце. Гэты нумар магчыма таксама даведацца на сайце Міністэрства па падатках і зборах, для гэтага дастаткова ўвесці свае прозвішча, імя і імя па бацьку. Ну а калі ж сума да аплаты не выстаўлена, то можна (трэба!) звярнуцца ў сваю падатковую інспекцыю, каб спецыялісты разлічылі падатак.

Для выплаты падаткаў у АРІП трэба ведаць свой уліковы нумар плацельшчыка (усё той жа УНП) і найменне падатковай інспекцыі, на карысць якой неабходна зрабіць плацёж. Для выплаты трэба па чарзе набраць: сістэму «Разлік», потым уводзім «падаткі», адпаведны рэгіён (горад ці раён), ІМПЗ пэўнага раёна (або сельскага савета), від падатку (зямельны падатак або падатак на нерухомасць) і ўводзім УНП. Гэта сцісла аб практыцы. А зараз інфармацыя дзеля разважання.

## Палова «заможных» падаткі не плаціць

У нашай краіне на ўліку ў падатковых органах знаходзіцца амаль 3 млн фізічных асоб, якія валодаюць альбо карыстаюцца аб'ектамі нерухомасці. «З іх крыху менш за палову грамадзян маюць права на льготы, адпаведна, падаткі ім не налічваюць і паведамленне на выплату не накіроўваюць. Большасць ільготнікаў — пенсіянеры», — адзначыў начальнік Галоўнага ўпраўлення.

Асобная катэгорыя — гэта інваліды I або II групы, шматдзетныя сем'і, непаўналетнія дзеці, грамадзяне, прызнаныя недзеяздольнымі. Але ў дачыненні да асобных аб'ектаў ёсць асаблівасць. Так, жылыя дамы, якія належаць гэтым грамадзянам, вызваляюцца ад падатку на нерухомасць, а зямельныя ўчасткі — на зямельны падатак, толькі ў тым выпадку, калі ў гэтых дамах не прапісаны працаздольныя грамадзяне. Таму, калі з пенсіянерам прапісаны яго працаздольныя дзеці, грамадзянін будзе абавязаны выплачваць падаткі. Сёлета сума налічаных плацяжоў па падатках на раллю і нерухомасць склала 133 мільёны рублёў. Але за выключэннем ільготнікаў да выплаты прад'яўлена толькі 58 мільёнаў рублёў.

Асноўная маса паведамленняў аб неабходнасці выплаты згаданых падаткаў накіроўваецца па пошце. Але ёсць і іншыя спосабы: накіраванне электроннага паведамлення ў асабісты кабінет фізічнай асобы, які адкрыты са згоды плацельшчыка на партале МПЗ, а таксама ўручэнне асабіста. Калі паведамленне адпраўлена па пошце альбо ў асабісты кабінет, яно лічыцца ўручаным у 10-дзённы тэрмін з моманту яго адпраўлення. Па пошце сёлета было накіравана 1,5 млн паведамленняў, яшчэ 175 тысяч — у электронным выглядзе праз асабісты кабінет.

«Колькасць электронных паведамленняў штогод расце. Мы праводзім актыўную работу з грамадзянамі па растлумачэнні магчымасці іх атрымання. Каб падключыцца да асабістага кабінета і атрымліваць такія паведамленні, трэба прыйсці ў падатковы орган з пашпартам і напісаць заяву», — дадаў Міхаіл Расолька.

Зарэгістраваўшыся ў асабістым кабінеце, можна атрымаць розныя паслугі ад падатковых органаў. Знаходзячыся ў любым пункце зямнога шара, пагледзець суму падатку, які падлягае да выплаты, свае плацяжы. Гэта сусветная тэндэнцыя — максімальна даступныя дыстанцыйныя адносіны з падатковымі органамі.

## Усярэднены падатак на нерухомасць 40 рублёў

Так, такі падатак у год трэба заплаціць сярэдняму ўладальніку хаткі, дачы, участка або «радавога гнязда». Дарэчы, у Мінску самы высокі кадастравы кошт зямельных участкаў, а таксама самая высокая ацэначная цана будынкаў і збудаванняў. Гэта ўплывае на памер маёмасных падаткаў. «Падатак на нерухомасць у сярэднім па краіне склаў 40 рублёў на аднаго плацельшчыка, пры гэтым у Мінску — 65 рублёў. Памер зямельнага падатку ў сярэднім па Беларусі — 18 рублёў, у сталіцы — 116 рублёў», — расказаў прадстаўнік міністэрства. Як бачыце, розніца значная.

Пры гэтым у асобных сітуацыях сумы падаткаў могуць быць значна вышэй за сярэднія.

— Бывае у нас і 600 рублёў падатак на нерухомасць. А зямельны падатак у Мінску можа быць і 200 рублёў. Чым даражэйшы дом, тым большы ў такога чалавека і падатак. Гэта залежыць ад плошчы і месцазнаходжання зямельнага ўчастка, а ў галоўным мегаполісе краіны досыць шмат прыватнага сектара, які знаходзіцца практычна ў цэнтры горада, — пракаментаваў Міхаіл Расолька.

## Кватэра плюс... кватэра

Калі ў чалавека ёсць адна кватэра (ці, скажам, адзін пакой у кватэры), то яму не трэба плаціць падатак на нерухомасць. Аднак калі іх дзве або больш, то ад падатку будзе вызвалена толькі адна з іх. За астатнія прыйдзецца заплаціць. Сёлета людзей, у якіх ва ўласнасці ёсць больш чым адно жылое памяшканне ў шматкватэрным доме, аказалася больш за 220 тысяч чалавек.

Найбольшая іх колькасць у Мінску, гэта больш за 67 тысяч грамадзян. У астатніх абласцях у сярэднім ад 20 да 28 тысяч, некалькі больш у Гомельскай вобласці — 35 тысяч чалавек. Міхаіл Расолька адзначыў, што такіх плацельшчыкаў з кожным годам становіцца ўсё больш.

— Яшчэ некалькі гадоў таму іх было крыху больш за 100 тысяч. Гэта значыць, за пяць гадоў колькасць павялічылася амаль удвая — заўважыў Міхаіл Расолька. — Сярод іх шмат тых, у каго ва ўласнасці ёсць кватэра і пакой. Напрыклад, трохпакаёвая кватэра па спадчыне дзеліцца паміж трыма дзецьмі. Атрымліваецца, у кагосьці з іх можа быць свая кватэра, а пасля атрымання спадчыны — яшчэ пакой.

Міхаіл Расолька нагадаў, што чалавек сам можа выбраць, па якім са сваіх памяшканняў ён будзе плаціць падатак. Але калі ён не паведаміць аб гэтым у падатковыя органы, то яму льготу аўтаматычна дадуць па першым памяшканні, якое аказалася ў яго ва ўласнасці.

## Стаўкі да 10 разоў не павялічацца

З гэтага года ўступіла ў сілу новая рэдакцыя Падатковага кодэкса. У цэлым стаўкі і льготы па маёмасных падатках засталіся на ранейшым узроўні, але ёсць і некаторыя змены.

Напрыклад, ужо сёлета адменена права абласных (Мінскага гарадскога) Саветаў дэпутатаў павялічваць да 10 разоў стаўкі падатку на нерухомасць па капітальных будынках, якія не выкарыстоўваюцца або выкарыстоўваюцца неэфектыўна. «Мэтай дзесяцiразовага павелічэння было прымусіць уласніка нерухомасці эфектыўна выкарыстоўваць будынак, каб ён не прастойваў. Але як паказала практыка, падаткаабкладанне па павышаных стаўках не з'яўляецца эфектыўным інструментам, і было прынята рашэнне адмовіцца ад гэтай нормы», — растлумачыў спецыяліст.

Таксама з 2019 года адменены дзесяціразовы каэфіцыент да ставак зямельнага падатку ў дачыненні да зямельных участкаў, прадстаўленых у часовае карыстанне і своечасова не вернутых, самавольна занятых, якія выкарыстоўваюцца не па мэтавым прызначэнні. За такія парушэнні належыць адміністрацыйная адказнасць, таму павышанае падаткаабкладанне палічылі залішнім. Акрамя таго, устаноўлена, што сёлета мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права павялічваць (памяншаць) стаўкі падатку на нерухомасць і зямельнага падатку асобным катэгорыям плацельшчыкаў не больш чым у 2,5 раза, а з 2020-га — не больш чым у два разы.

## Патрэбныя нюансы

Чытачоў «Звязды» цікавіў адзін прыватны, але распаўсюджаны выпадак. У вёсках, у садовых таварыствах у многіх з іх ёсць нерухомая маёмасць. Яна перайшла ад памерлых бацькоў (іншых сваякоў) па спадчыне. Часта такія будынкі ўжо вельмі старыя і практычна нічога не каштуюць. Але па дакументах, за іх трэба плаціць з кожным годам усё большыя сумы (яны індэксуюцца).

Міхаіл Расолька адзначыў, што ў выпадку нязгоды грамадзяніна з вынікамі гэтай ацэнкі, ён можа звярнуцца да незалежных ацэншчыкаў, якія маюць ліцэнзію, па рыначную ацэнку свайго будынка. Калі рыначная ацэнка будзе ніжэйшая, чым тая, якая дзейнічае, тады падатак будзе пералічаны, а пераплачаныя грошы вернуты.

І яшчэ. Пры нявыплаце зямельнага падатку і падатку на нерухомасць своечасова за кожны каляндарны дзень пратэрміноўкі налічваюцца пені. Акрамя таго, нявыплата або няпоўная аплата плацельшчыкам сум падаткаў цягнуць накладанне штрафу. Сумы падаткаў, якія не былі выплачаны ў бюджэт добраахвотна, спаганяюцца ў прымусовым парадку праз суд з налічэннем пені за кожны каляндарны дзень пратэрміноўкі. За нявыплату або няпоўную аплату накладаецца штраф у памеры 15 працэнтаў ад нявыплачанай сумы падатку, але не менш за 0,5 базавай велічыні (12,25 рубля).

**Сяргей КУРКАЧ.**

### У тэму

Міністэрства па падатках і зборах папярэджвае плацельшчыкаў аб рассыланні шкодных паведамленняў нібыта ад імя міністэрства.

«На электронныя адрасы плацельшчыкаў паступаюць паведамленні з электроннага адраса nalog.gov@tut.by (нібыта ад імя Міністэрства па падатках і зборах), якія ўтрымліваюць шкоднаснае праграмнае забеспячэнне. МПЗ просіць праяўляць пільнасць пры выкарыстанні электроннай пошты і ўважліва глядзець на адпраўніка, які выкарыстоўвае ў сваім электронным адрасе даменнае імя падатковых органаў», — адзначылі ў міністэрстве. МПЗ нагадвае, што рассыланне паведамленняў і абвестак адбываецца толькі праз цэнтр інфармавання плацельшчыкаў з выкарыстаннем даменнага імені @nalog.gov.by


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ФИЛИАЛА «ТП КОЛПЕНИЦА» ОАО «ТБЗ ЛЯХОВИЧСКИЙ»

**Предмет аукциона – Лот № 2**

1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88800 (наименование: магазин; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 149,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, п. Кабушкина, ул. Заводская, 6, на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000022, площадью 0,0219 га. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание магазина.

| Начальная цена, руб.: | 1 базовая величина (25,5 руб.) | Задаток, руб.: | 1 базовая величина (25,5 руб.) |
|---|---|---|---|

Продавец: филиал «ТП Колпеница» ОАО «ТБЗ Ляховичский» Брестская обл., Барановичский р-н, п. Октябрьский, ул. Центральная, 8А, УНП 200069282. Организатор аукциона: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Номер р/с для перечисления задатка: р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245. Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты: в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Условия продажи.** Объекты продаются на следующих условиях: для негосударственных юридических лиц, индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, иностранных юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: осуществление покупателем предпринимательской деятельности с использованием приобретенных объектов и (или) построенных новых объектов в случае сноса приобретенного имущества либо отдельных объектов, входящих в состав приобретенного имущества, которые не могут быть использованы им для осуществления указанной деятельности; запрет на отчуждение приобретенных объектов до выполнения покупателем условий договора купли-продажи предмета торгов; для физических лиц – реконструкция недвижимого имущества, за исключением изолированных помещений, под жилое помещение и (или) для ведения личного подсобного хозяйства. Срок выполнения условий – 1 (один) год

**Аукцион состоится 5 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 4 ноября 2019 г. до 17.00**

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона

* Ранее извещение о продаже имущества опубликовано в газете «Звязда» от 29.08.2019



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | Червенское райпо, Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Ленинская, 32 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Магазин № 57** (составные части: два склада) | 435,3 кв. м | 615/С-16180 | Минская обл., Червенский р-н, **г. Червень,** ул. К. Либкнехта, д. 28а |

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1103** га, предоставлен на праве аренды (срок действия по 23.05.2038) для обслуживания магазина № 57. Ограничения (обременения): охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0198 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 180 763,32 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 рабочих дней после проведения аукциона** |
|---|---|

**Условия оплаты предмета аукциона**

30 % от цены продажи имущества с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачивается в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 5 (пяти) месяцев с учетом индексации

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.02.2019

**Дата и время проведения аукциона: 05.11.2019 в 11. 00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.11.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**



## Уважаемые акционеры ОАО «Дрожжевой комбинат»!

**31 октября 2019 года в 11.00 проводится внеочередное собрание акционеров общества по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 14, актовый зал.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. «О доизбрании члена наблюдательного совета ОАО «Дрожжевой комбинат».
2. «О доизбрании члена ревизионной комиссии ОАО «Дрожжевой комбинат».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется в день проведения собрания по месту (адресу) проведения собрания при предъявлении акционерами (их представителями) документов, подтверждающих их полномочия (акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном законодательством порядке).

Время начала регистрации: 10.20. Время окончания регистрации: 10.50.

Дата формирования реестра владельцев акций общества, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в собрании, 21.10.2019 года.

УНН 100104781.
Администрация.
Наблюдательный совет

## Запрашальнік

# ВОСЕНЬ. КУПАЛА. ПЕЦЯРБУРГ

**Учора ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы пачала працаваць выстаўка «Душой я вольны чалавек», прымеркаваная да 110-годдзя прыезду беларускага паэта ў Санкт-Пецярбург.**

«Горад, у якім паэт жыў і вучыўся ў 1909—1913 гадах, адыграў вялікую ролю ў станаўленні яго літаратурнага майстэрства: тут убачылі свет яго першыя зборнікі, адбылася трыумфальная прэм'ера «Паўлінкі» — славутай п'есы, якая і сёння з'яўляецца візітоўкай беларускага тэатра», — нагадваюць супрацоўнікі музея.

Экспазіцыя расказвае пра «купалаўскі Пецярбург» як цэнтр беларускага нацыянальнага адраджэння, у якім паэт знайшоў сяброў і аднадумцаў: прафесара Браніслава Эпімаха-Шыпілу, этнографа Антона Грыневіча, Вацлава Іваноўскага, Алаізу Пашкевіч. Унікальныя архіўныя дакументы асвятляюць дзейнасць першай беларускай легальнай выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца», Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта, пецярбургскую пастаноўку «Паўлінкі» ў 1913-м, пазнейшыя візіты паэта ў Ленінград у 1920—1930-х гадах. А карта з «беларускімі адрасамі» дапамагае адшукаць купалаўскія мясціны і ў сучасным Санкт-Пецярбургу. Асобны раздзел выстаўкі знаёміць наведвальнікаў з перакладамі вершаў Янкі Купалы, якія рабілі яго блізкі сябар Апалон Карынфскі, Максім Горкі, Валерый Брусаў, Сяргей Гарадзецкі, а таксама з купалаўскім перакладам паэмы Пушкіна «Медны коннік», які даследчыкі называюць адным з самых значных у творчай спадчыне песняра. Акрамя дакументаў, у экспазіцыі прадстаўлены работы айчынных мастакоў: жывапісцаў і графікаў Уладзіміра Сулкоўскага, Янкі Раманоўскага, Віктара Александровіча, скульптараў Валяр'яна Янушкевіча і Паўла Лука.

Выстаўка «Душой я вольны чалавек» будзе працаваць у музеі да 5 снежня.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Сведкі эпохі

# КАШТОЎНАСЦІ ВЯРТАЮЦЦА



**Чарговы праект па вяртанні ў нашу краіну гісторыка-культурных каштоўнасцяў рэалізаваны дзякуючы пасольству Беларусі ў Францыі.**

Літаральна ў мінулую суботу, 19 кастрычніка, актыўная прадстаўніца беларускай дыяспары ў Францыі Анастасія Данілава бязвыплатна перадала для фондаў Мірскага замка тры веeры ручной работы XIX стагоддзя. Менавіта гэтыя аксесуары, гаворыцца ў прэс-рэлізе пасольства, раней ніколі не знаходзіліся на тэрыторыі нашай краіны, але ўсе яны належаць да эпохі, калі такія веeры заходнееўрапейскай вытворчасці выкарыстоўваліся прадстаўнікамі беларускай шляхты.

Веeры памерам каля 30 сантыметраў датуюцца прыблізна 1880—1890 гадамі і ўяўляюць сабой падвойны ліст размаляванай тканіны з пастаральнымі сцэнамі жыцця ў вёсцы і кветкавымі кампазіцыямі. Раней яны знаходзіліся ў прыватнай калекцыі і былі набытыя спецыяльна для перадачы ў Мірскі замак, дзе зоймуць належнае месца ў экспазіцыі.

«Гэта ўжо не першы праект па вяртанні культурных каштоўнасцяў у Рэспубліку Беларусь, рэалізаваны пасольствам Беларусі ў Францыі разам з Анастасіяй Данілавай, — гаворыцца ў афіцыйным паведамленні пасольства. — Раней у 2018 і 2019 гадах для Мірскага замка былі набытыя два габелены XVII стагоддзя». За актыўную працу па развіцці беларуска-французскіх культурных адносін Анастасія Данілава падчас цырымоніі перадачы вееpаў атрымала падзяку міністра культуры Беларусі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**
**Фота пасольства Беларусі ў Францыі.**

# РУХ НАСУСТРАЧ

## Ці папоўніць Аўгустоўскі канал спіс Сусветнай спадчыны?




**Гэтае пытанне будзе абмеркавана падчас міжнароднай канферэнцыі, якая адбудзецца 5-6 лістапада з удзелам эксперта ЮНЕСКА. Першы дзень канферэнцыі пройдзе ў польскім Аўгустове, другі — у Гродне. Напярэдадні гэтай падзеі прадстаўнікі ўлад абодвух рэгіёнаў сустрэліся, каб узгадніць свае пазіцыі.**

З гэтай нагоды ў Гродне пабывала дэлегацыя Аўгустова на чале з яго бургмістрам Мірaславам Каральчуком. Падчас рабочай сустрэчы было адзначана, што абодва бакі актыўна працуюць над тым, каб Аўгустоўскі канал быў уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны.

— Гэта складаная паэтапная работа, якая пастаянна вядзецца, — кажа **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.** — Мы разумеем, што недастаткова прадставіць канал як гідратэхнічнае збудаванне. Стаіць задача прэзентаваць яго як унікальны аб'ект з багатай гісторыяй, вакол якога знаходзіцца мноства культурных каштоўнасцяў.

Па словах Міраслава Карaльчука, міжнародная канферэнцыя з удзелам эксперта ЮНЕСКА дазволіць акрэсліць выніковыя задачы па ўключэнні канала ў спіс Сусветнай спадчыны.

— Мы павінны быць гатовы адказаць на ўсе пытанні міжнароднага эксперта і даказаць, што Аўгустоўскі канал сапраўды гэтага варты, — падкрэсліў Міраслаў Карaльчук. — Таксама будзе абмяркоўвацца тэма турыстычнага патэнцыялу нашага агульнага з гродзенцамі аб'екта.

Падчас сустрэчы была дасягнута дамоўленасць па распрацоўцы адзінага брэнда Аўгустоўскага канала. Таксама неабходна стварыць агульную інфармацыйную і рэкламную платформу для папулярызацыі турыстычнага аб'екта.

Дарэчы, нядаўна ў Гродне адбылася прэзентацыя новага мабільнага гіда па веламаршрутах уздоўж канала. Гэтая работа будзе працягнута. Ёсць ідэя стварыць мабільную праграму з усімі аб'ектамі па абодва бакі канала.

Станоўчым фактарам для прыцягнення турыстаў стане пашырэнне бязвізавай зоны — з 10 лістапада ўвесь Гродзенскі рэгіён стане бязвізавым. Плануецца стварыць цікавую інфраструктуру. Напрыклад, у Гродне ёсць намер узвесці амфітэатр з відам на Нёман, а на канале стварыць музей на вадзе.

Нагадаем, што ў Беларусі чатыры аб'екты ўваходзяць у спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА: замкавы комплекс «Мір», Нацыянальны парк «Белавежская пушча», архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы і геадэзічная дуга Струвэ. Яшчэ шэраг аб'ектаў прадстаўлены для разгляду. У іх ліку — Аўгустоўскі канал, Сафійскі сабор, Каложская царква і іншыя.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

## Шануй сваё

# СМАРГОНСКІЯ НАЙГРЫШЫ: ЗАБЫЦЦА НЕЛЬГА ЗБЕРАГЧЫ

**У інвентары жывой спадчыны Беларусі захоўваюцца і спеўныя, і танцавальныя, і кулінарныя, і ткацкія, і разнастайныя абрадавыя традыцыі. Сёлета Смаргонскі раён прапануе папоўніць Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь новым элементам нематэрыяльнай культурнай спадчыны, які завецца «Традыцыйны музычна-інструментальны выканальніцкі стыль смаргонскага міжрэчча Віліі і Гальшанкі». За складаным, здавалася б, вызначэннем хаваецца не што іншае, як народная музыка — простая, родная і блізкая кожнаму.**



Традыцыйныя найгрышы на тэрыторыі міжрэчча Віліі і Гальшанкі нязменна суправаджалі вольны час мясцовых сялян. Выканаўцы — музыкі-самавучкі — ігралі ў вясковых хатах на вяселлях і на танцах, з лёгкасцю пераходзячы з адной мелодыі на другую. Свой музыкант-саліст або ансамбль (капэла) быў амаль у кожнай вёсцы. Музыка была ў асноўным танцавальная, з элементамі імправізацыі, вельмі рытмічная і бадзёрая.

На Смаргоншчыне капэл было шмат. Яны складаліся з салірующай скрыпкі, часам узмоцненай кларнетам, гармоніка ці акардэона і барабана. Такая капэла ўяўляе сабой яскравы прыклад так званай траістай музыкі — усходнееўрапейскага трохсастаўнага музычна-інструментальнага камернага гурта для суправаджэння танцаў і абрадаў.

У 1990-я гады выканальніцкую традыцыю капэлы траістай музыкі пераняў мультыінструменталіст, смаргонец Чэслаў Жых (кіраўнік узорнага ансамбля народнай музыкі «Гулянок») ад народнага музыканта Уладзіслава Будзько «з рукі на руку» — гэтая методыка перадачы элемента захавалася з пачатку XX стагоддзя.

На жаль, музыка нашых дзядоў і прадзедаў пасля сацыяльна-культурных пераўтварэнняў на вёсцы стала незапатрабаваная. Сёння ж носьбіты традыцыі прыкладаюць усе намаганні, каб удыхнуць у народнае інструментальнае выканальніцтва новае жыццё, адрадзіць і зберагчы несправядліва забытую каштоўнасць.

На сёння ў Смаргонскім раёне налічваецца 14 носьбітаў элементаў, а таксама 11 вучняў і пераемнікаў. Найгрышы гучаць у Смаргоні і ў аграгарадку Жодзішкі, таксама любяць гэту музыку ў Крэве, Сіньках, Вішневе, Валэйкавічах. Найгрышы суправаджаюць вяселлі, сямейныя святы, народныя і афіцыйныя ўрачыстасці, вечарыны і конкурсы пабытавых танцаў. Носьбіты ўдзельнічаюць у разнастайных канцэртных праграмах раённых свят, шматлікіх рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях.



Традыцыйны музычна-інструментальны выканальніцкі стыль смаргонскага міжрэчча Віліі і Гальшанкі складаецца з шэрагу мелодый, адна частка з якіх актыўна выкарыстоўваецца, другая — знаходзіцца ў стадыі вывучэння, расшыфроўкі і асваення.

Узор выдатнай культурнай каштоўнасці на высокім узроўні прэзентуецца праз творчасць удзельнікаў узорнага ансамбля народнай музыкі «Гулянок» і ўзорнага фальклорнага калектыву «Нальшчаначка». Сёння калектывы суправаджаюць рэгістрацыі шлюбаў і вясельныя святкаванні, прыцягваюць увагу зацікаўленай моладзі, дораць шмат пазітыўных эмоцый прадстаўнікам старэйшага пакалення, пераносячы іх у маладыя гады.

Мы маем унікальную магчымасць — арганізаваць свята ў традыцыйным стылі і не толькі цудоўна правесці час, але і дакрануцца да жывой спадчыны сваіх продкаў, адчуць яднанне з імі. Мы маем заслужанае права ганарыцца сваім народам і багатай, самабытнай нацыянальнай культурай.

**Алена БОБІНА,**
**метадыст па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Смаргонскага раённага цэнтра культуры.**

Найноўшая гісторыя

# НАЗАЎЖДЫ РАЗАМ

## Уз'яднанне адзінага народа ў адзінай дзяржаве

| **Здания и сооружения авторынка** в составе: **открытый склад № 1 (**8916,3 кв. м, 110/С-62149, составные части и принадлежности: покрытия, железнодорожный подъездной путь, забор, 2 ворот), **торговые павильоны (**345,8 кв. м, 110/С-100114), **магазин автозапчастей** (98,8 кв. м, 110/С-86092), **туалет** (28,6 кв. м, 110/С-99800), **пост охраны** (7,7 кв. м, 110/С-99750), забор авторынка (металлич.) (инв. № 9061), кран мостовой (инв. № 4155), передвижные киоски (инв. № 1000020, 1000021, 1000022), шлагбаум Ditec (инв. № 9059), шлагбаум электромеханич. XBAR 01079 (инв. № 9169). ***Сведения о земельных участках***: пл. **2,4570** га и **0,0137** га предоставлены продавцу для обслуживания зданий и сооружений авторынка на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 411 639,75 бел. руб.** | |
| **Лот № 2** Месторасположение **– Гродненская обл., г. Гродно, пер. Победы, 5** | |
| **Производственная база** в составе: **здание склада (**696,8 кв. м 400/С-25199, составные части: покрытия асфальтобетон, цементно-бетонное, ограждение кирпичное, линия электропередачи), **склад (мастерские)** (921,1 кв. м, 400/С-25198, составные части: склад, теплоузел), **навес** (294,6 кв. м, 400/С-25204, составные части и принадлежности: покрытие асфальтобетонное, ограждение кирпичное, водопроводная сеть), **навес (**122,2 кв. м, 400/С-43272), **производственный корпус** (1528,2 кв. м, 400/С-25202), **административное здание** (429,1 кв. м, 400/С-25203, составные части: покрытия асфальтобет. и цементо-бетон., подпорная стена, ограждения кирпичное и металлич., ворота, калитка, водопроводная сеть, канализационная сеть, линия электропередачи), участки многолетних насаждений (инв. № 0000609, 0000610, 0000617), системы тревожной сигнализации (инв. № 47069), охранной (инв. № 0000466) и видеонаблюдения (инв. № 47067), котел стальной твердотопливный КСТБ-95 (инв. № 0000251, 0000250) и КЧУ-7-63А (инв. № 40002). ***Сведения о земельных участках***: пл. **1,4381** га (обременения – сервитут 0,0625 га), **0,2078** га **0,3867** га (обременения – охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения, канализации) предоставлены продавцу для обслуживания зданий и сооружений на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 799 744,69 бел. руб.** (снижена на 50 %) | |
| **Обременения по лотам:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания находятся в залоге у банков. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20 рабочих дней после проведения аукциона** |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | |
| Предыдущие извещения о проведении аукционов опубликованы в газете «Звязда»: по лоту № 1 – 04.09.2019, по лоту № 2 – 19.09.2019 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Аукцион состоится 05.11.2019 в 11. 00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 04.11.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by | |

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**
Продавец: УП «МИНСКОБЛСЕЛЬСТРОЙ», 220005, г. Минск, ул. Смолячкова, 9.
Публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 ноября 2019 г**. 09.00-17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**
Предмет торгов – **Изолированное помещение, инв. № 500/D-708035660 по адресу: г. Минск, ул. Щорса 2-я, 5-47, площадь – 241,0 кв. м.** Начальная цена – 85 780,43 бел. руб., без НДС. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.
Для участия в торгах необходимо в срок по 20.11.2019 г. 17.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 15 рабочих дней со дня проведения торгов.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении первых повторных торгов в форме конкурса по продаже имущества ОАО «Забашевичи

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | ООО «Фрондера», 220113, Республика Беларусь, г. Минск, улица Мележа, д. 1, офис 1121, тел. 8 (029) 305 86 50 |
| Продавец | ОАО «Забашевичи» (222117 Минская обл., Борисовский р-н, Гливинский с/с, аг. Забашевичи, тел. +375 17 772 71 12) в лице управляющего – ООО «ПрофДМ» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-27, тел. +375 17 395 89 17) |
| Форма, дата, место и время проведения торгов | **Торги в форме конкурса (в том числе повторные) проводятся 15.11.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121** |
| Сведения о предмете торгов | **Лот № 1:** предприятие как единый имущественный комплекс «Племферма». Место нахождения лота: Республика Беларусь, Минская обл., Борисовский район, Лошницкий с/с, восточнее аг. Лошница |
| Начальная цена предмета торгов (без учета НДС) | **Лот № 1: 1 374 400,00** BYN (один миллион триста семьдесят четыре тысячи четыреста белорусских рублей 00 копеек) без НДС, согласно подп. 2.30.1 ст.115 Налогового кодекса Республики Беларусь (Особенная часть) от 29.12.2009 № 71-З |
| Условия конкурса | Сохранение назначения продаваемого объекта для целей производства с/х продукции |
| Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка | Сумма задатка для участия в торгах – **1 % от начальной стоимости лота,** что составляет **13744,00** BYN (тринадцать тысяч семьсот сорок четыре белорусских рубля 00 копеек). Сумма задатка в срок по **14.11.2019 (включительно)** вносится в бел. руб. на р/с **BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в конкурсе по продаже имущества ОАО «Забашевичи», проводимом 15.11.2019 г. |
| Сроки приема заявок на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | Заявки на участие в торгах и прилагаемые док-ты принимаются в срок **до 18.00 13.11.2019** по адресу: **220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.** К заявке прилагаются: платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юр. полномочия участников торгов: для юр. лиц – копия свидетельства о гос. регистрации; доверенность, выданная представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), для ИП – копия свидетельства о гос. регистрации ИП; для физ. лица – копия паспорта |
| Возмещение затрат на организацию и проведение торгов | Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса производится победителем конкурса по фактическим затратам (расходы на проведение конкурса; расходы на проведение оценки имущества, выставленного на торги; вознаграждение аукционисту, расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи). Победитель торгов обязан перечислить на р/с продавца сумму фактических затрат в течение 5 дней со дня проведения конкурса. **Вознаграждение аукциониста – 3 % от начальной цены предмета торгов** |
| Порядок оформления участия в торгах | К участию в конкурсе допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный в настоящем извещении срок заявку (с приложением необходимых документов) и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении р/с сумму задатка, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов, сдать запечатанные конверты с предложениями по цене предмета торгов и выполнению условий конкурса, получить конкурсные номера |
| Критерии выявления победителя конкурса | Победителем конкурса будет признан участник, предложивший, по мнению комиссии по проведению торгов, лучшие условия. В случае если предложения двух и более участников полностью соответствуют условиям конкурса и являются аналогичными по существу, победителем будет признан участник, предложивший наивысшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки только одним участником или явки на торги одного из участников и при соответствии предложений претендента на покупку условиям конкурса производится продажа предмета конкурса этому претенденту на предложенных им условиях. При прочих равных условиях преимущественное право на приобретение указанного имущества принадлежит сельскохозяйственным организациям, расположенным в этой местности |
| Срок подписания и условия договора купли- продажи предмета торгов и оплаты | После предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов, между продавцом и победителем конкурса заключается договор купли-продажи предмета торгов. Договор купли-продажи предмета торгов должен быть подписан не позднее 30 календарных дней с момента подписания протокола о результатах конкурса. Оплата стоимости предприятия как имущественного комплекса победителем торгов в срок не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов. Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет |
| Дополнительная информация | По вопросу ознакомления с предметом торгов обращаться по тел. +375 (29) 862-80-48 (Лекарев Василий Иванович). Дополнительная информация по предмету торгов, в том числе о составе предприятия как имущественного комплекса, – по телефону +375 (29) 308-28-97 (Анаида). Организация и проведение конкурса осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», Указа Президента Республики Беларусь от 04.07.2016 № 253 «О мерах по финансовому оздоровлению сельскохозяйственных организаций», Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» |
| Ранее опубликованные объявления | Журнал «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие». – 2019. – № 9. – С. 55; газета «Звязда» – № 176 от 17.09.2019. – С. 11 |

# СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Хтосьці трапна параўнаў EdCamp з наркотыкам, ад якога немагчыма адмовіцца. Хтосьці назваў яго настаўніцкім кіслародам, які дапамагае выжываць. **Многія з удзельнікаў педагагічнай (не)канферэнцыі лічаць сябе белымі варонамі ў школах, а EdCamp дае ім магчымасць трапіць у чараду такіх жа, як ты сам.** Эфект нефармальнай сустрэчы актыўных настаўнікаў у тым, што яна натхняе, пасля яе хочацца працаваць па-новаму, творча, актыўна, плённа і ў сучасным фармаце. «Супрацоўніцтва — для будучыні» — менавіта так была сфармуляваная агульная ідэя для EdCamp Belarus — 2019.

Госцем мерапрыемства стала **пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі Жаклін ПЕРКІНС**: менавіта дзякуючы пасольству гэтай краіны адбыўся візіт у Беларусь такой «мегазоркі», як Рос Морысан МАКГІЛ. Яго сайт teachertoolkit.co.uk рэгулярна ўваходзіць у топ-100 самых карысных педагагічных рэсурсаў. Рос Макгіл намінаваўся газетай The Sunday Times на званне аднаго з 500 самых уплывовых людзей Вялікабрытаніі. Больш за 25 гадоў ён выкладаў працоўнае навучанне і тэхналогіі (быў «Настаўнікам года Вялікабрытаніі» ў 2004 годзе) і кіраваў адной з самых складаных лонданскіх школ.

— Сёння мы жывём ва ўмовах глабалізацыі, крыніц інфармацыі вельмі шмат, іх колькасць пастаянна павялічваецца. Медыяпісьменнасць, пра якую мы будзем сёння тут казаць, вельмі важны навык, які трэба развіваць у падрастаючага пакалення, — падкрэсліла спадарыня Жаклін Перкінс. — Як адрозніць праўдзівую інфармацыю ад непраўдзівай? Брытанскае пасольства зацікаўлена ў падтрымцы праграм па супрацьдзеянні дэзінфармацыі.

## ТРЫ ПУНКТЫ АПОРЫ

— Я адкрыю для вас сакрэт: педагогіка — гэта навука, — распачала з жарту сваё выступленне **намеснік старшыні Таварыства беларускай школы Тамара МАЦКЕВІЧ.** — А навука любое слова, не пацверджанае лічбай, лічыць пустым. Да пэўнага часу нашы педагогі-навукоўцы нават не падазравалі, што існуе агульнапрынятая методыка разліку эфектыўнасці ўздзеяння розных фактараў на навучанне. І любое новаўвядзенне — ці новы падручнік, ці школьная форма, працягласць канікул, выкарыстанне гаджэтаў ці час пачатку заняткаў, — усё папярэдне даследуецца і вымяраецца ў лічбах, а толькі потым прымаецца рашэнне, ці ўкараняць гэта ў адукацыйны працэс. Дык вось, самым эфектыўным фактарам уздзеяння на акадэмічную паспяховасць вучняў, на якасць навучання была прызнаная «калектыўная эфектыўнасць настаўнікаў». Калі тлумачыць проста, то гэта ўпэўненасць настаўнікаў у тым, што калектыўнымі высілкамі яны могуць дасягнуць значных вынікаў. Нават калі ім дасталіся не самыя таленавітыя і матываваныя вучні.

А вось праблемы, якія выклікаюць самыя гарачыя спрэчкі ў нашым грамадстве, маюць найменшы памер эфекту: колькасць вучняў у класе, неабходнасць пакідаць няўдачнікаў на паўторнае навучанне, магчымасць выбару школы, увядзенне школьнай формы... Мы забіраем мабільныя тэлефоны ў дзяцей, замест таго каб выкарыстоўваць іх у навучальным працэсе.

— Добра ўжо тое, што слова «рэформа» больш не асацыюецца ў нас з пагрозай, — разважае Тамара Мацкевіч. — Як фізік па



Рос Морысан МАКГІЛ: «Грамадскасць не думае, што вы, дарагія настаўнікі, працуеце шмат. Таксама яны думаюць, што вам плацяць добра...»

адукацыі, скажу вам, што патрэбны як мінімум тры пункты апоры, каб рэформа была паспяховая: гэта рэформа ў змесце, у тэхналогіях і метадыцы і ў сістэме кіравання адукацыяй. Настаўнікі, на жаль, пакуль мала могуць уплываць на змест, але дзякуючы рэалізацыі праграмы па медыяадукацыі мы паступова пачынаем змяняць напаўненне падручнікаў, робім іх больш сучаснымі. Кіраўнікоў устаноў адукацыі мы таксама пакуль не выбіраем. А вось тэхналогіі навучання ў нашых руках. Трэба толькі даць больш свабоду настаўнікам...

## ІНФАРМАЦЫЯ ЦІ МЕРКАВАННІ?

Старт (не)канферэнцыі дала панельная дыскусія на тэму «Узаемадзеянне бізнесу і адукацыі: што, акрамя грошай?». Адным з прыкладаў такога паспяховага ўзаемапранікнення стала праграма «Настаўнік для Беларусі».

— Гэта сумесны праект БПБ-Ашчадбанка і Міністэрства адукацыі. Ён нацэлены на прыцягненне ў школы ў невялікіх гарадах і населеных пунктах крэатыўных і неабыякавых настаўнікаў, якія могуць і хочуць прыўнесці ў прафесію педагога новыя ідэі, імкнуцца да самаразвіцця, гатовы да змен (у тым ліку і да пераезду на новае месца) і вераць у свае сілы, — тлумачыць **Алена МЕЛЬЧАНКА, аператар праграмы «Настаўнік для Беларусі».** — Быў створаны мясцовы адукацыйны фонд «Новая школа», да праекта могуць далучыцца любыя кампаніі-донары, якія жадаюць зрабіць унёсак у развіццё якаснай адукацыі ў рэгіёнах. Мы вельмі спадзяёмся, што наша праграма зробіцца своеасаблівым інкубатарам адукацыйных праектаў. Кожны настаўнік, які стаў яе часткай, павінен будзе прыдумаць і рэалізаваць праект, які ўпішацца ў мясцовы кантэкст і зробіць школу цэнтрам лакальнай супольнасці. Гэта можа быць класны ці агульнашкольны праект, у які будуць уцягнуты і бацькі школьніка, і педагогі, і жыхары навакольных населеных пунктаў: ад стварэння школьнага тэатра да вырашэння экалагічных задач. А затым мы зможам трансляваць іх вопыт і на іншыя рэгіёны.

— У бізнесе я прызвычаіўся вырашаць усе пытанні, выкарыстоўваючы пэўны алгарытм: ад пастаноўкі праблемы да пошуку яе рашэнняў, — падкрэслівае **сузаснавальнік і кіруючы партнёр анлайн-гіпермаркета 21vek.by Павел МАТУСЕВІЧ.** — Але я назіраю нізкую ўцягнутасць людзей ва ўласнае жыццё, ім нецікава тое, што з імі адбываецца. Я не ведаю, як і калі ў школе «забіваюць» гэту зацікаўленасць. Мне важна, каб у маёй кампаніі ўсе разумелі, якая ў нас агульная мэта, і каб ведалі сувязь паміж агульнай і асабістай мэтамі. На маю думку, у адукацыі трэба фарміраваць прастору для ўсвядомленага выбару, фарміраваць у дзяцей навык вучыцца.

— А я працую ў ВНУ з тым, што атрымалася ці не атрымалася ў вас, — звяртаецца да школьных настаўнікаў **прадстаўнік ВТБ-банка і ўніверсітэцкі выкладчык Міхаіл НАВАСЁЛАЎ.** — І мушу канстатаваць, што студэнты не ўмеюць працаваць з інфармацыяй і крытычна яе ўспрымаць. Яны карыстаюцца не інфармацыяй, а меркаваннямі. І не ствараюць уласныя думкі. Калі ім не падабаецца меркаванне, то яны знойдуць іншае, якое іх задаволіць.

— Мы ўсе не умеем задаваць пытанні, таму што ў школе гэта, мякка кажучы, не віталася, у ВНУ за пытанні да выкладчыка можна было атрымаць прозвішча «батан». На першым рабочым месцы маладому спецыялісту таксама кажуць: «Не пытайся, я ж табе ўсё патлумачыў». Між іншым, уменне задаваць пытанні — вельмі карысны навык для кожнага з нас, — упэўнена **Ксенія КРУЧЫНІНА, кіраўнік human research department інвестыцыйнай кампаніі (фонду) Haxus.** — Мы не ведаем, якія навыкі патрэбны сучаснай моладзі, чаму іх вучыць. Дык давайце запытаемся пра гэта ў саміх маладых людзей...

## АДУКАЦЫЙНЫЯ ТРЭНДЫ

Безумоўна, самым захапляльным атрымаўся кірмаш педагагічных ідэй, дзеля чаго, уласна кажучы, педагогі і сабраліся. У ахвотных была толькі адна хвіліна на тое, каб прыцягнуць увагу калег. Настаўнікі хацелі падзяліцца досведам стварэння медыяўрокаў і нестандартных класных гадзін, STEAM-падыходамі ў выкладанні... біялогіі, стратэгіямі актыўнай ацэнкі пры вывучэнні лірычных твораў на ўроках літаратуры, выкарыстаннем актыўнай ацэнкі ў рабоце класнага кіраўніка, прыёмамі драмагерменеўтыкі на ўроках гісторыі, выкарыстаннем мнематэхнік для ўдасканалення лексічных навыкаў, тэхналогіяй праектнага навучання EduScrum.

Тамара КАЧКАН , настаўніца беларускай мовы і літаратуры з ВПК «Падольскі дзіцячы сад — сярэдняя школа» Астравецкага раёна, прапанавала правесці майстар-клас на тэму «Прыёмы візуалізацыі вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай літаратуры, або Як пазбегнуць эфекту «скразняку». «Чым дапамогуць сакрэты Серафіні на сучасным уроку?» — інтрыгавала калег настаўнік гісторыі і грамадазнаўства з сярэдняй школы № 2 г. Рагачова Вольга КРАЎЧАНКА. «Мабільны тэлефон на ўроку: воўк у авечай скуры ці эфектыўны сродак удасканалення вучэбна-пазнавальнай кампетэнцыі навучэнца?» — заваблівала ўдзельнікаў EdCamp настаўніца замежнай мовы з лепельскай гімназіі Кацярына ЗАЯЦ.

«У адно вуха ўлятае, у другое... ці Сакрэты эйдэтыкі для X, Y, Z», — так сфармулявалі сваю ідэю настаўніца англійскай мовы з мазырскай сярэдняй школы № 14 Вераніка АРЛОВА і намеснік дырэктара СШ № 14 г. Наваполацка Вольга КЕЦКО.

Была заяўлена і такая тэма, як «Брыкалаж у адукацыі». Гэта новы адукацыйны трэнд, сутнасць якога заключаецца ў выкарыстанні педагогам падручных сродкаў і інструментаў для развіцця творчага мыслення ў сваіх выхаванцаў. Гэта можа быць усё што заўгодна, акрамя падручнікаў. Такі метад не патрабуе гатовых метадычак і дазволаў зверху.

«Як зрабіць адкрыты ўрок бяспечным для настаўніка, які яго дае, і эфектыўным для ўсіх, хто будзе на ім прысутнічаць?» — так гучала тэма майстар-класа намесніка дырэктара жлобінскай сярэдняй школы № 13 Алены АНАНЧЫКАВАЙ. Усім удзельнікам (не)канферэнцыі даваліся тры стыкеры, якімі яны маглі прагаласаваць за тыя тэмы, якія здаліся ім найбольш актуальнымі. І гэта была задача не з лёгкіх, таму што пачуць хацелася ўсіх.

## ХТО ПРАЦУЕ ШМАТ?

«Для настаўнікаў, якія не дзеляцца з калегамі сваімі ведамі, у пекле будзе адмысловае месца», — пажартаваў брытанскі госць Рос Морысан Макгіл. Рос адносіцца да тых нямногіх, хто затрымаўся ў школе на 25 гадоў. Таму што «педагогіка — у маёй ДНК», як ён сам пра сябе кажа. Справа ў тым, што педагагічная дзейнасць — непрэстыжны занятак не толькі ў нашай краіне, а паўсюдна.

— Цяпер у Вялікабрытаніі налічваецца 443 тысячы настаўнікаў. Кожны год у школы прыходзяць прыблізна 20—25 тысяч новых. І ўпершыню атрымалася, што сышло больш педагогаў, чым прыйшло. Статыстыка сведчыць, што ў сярэднім настаўнік працуе ў школе 13 гадоў. Да 40 % маладых педагогаў сыходзяць у першыя пяць гадоў (большасць — у першыя два-тры гады работы), — канстатуе Рос. — 350 тысяч кваліфікаваных настаўнікаў з дыпломамі ў Брытаніі цяпер не працуюць па атрыманай прафесіі: яны або не прыходзяць у школы, атрымаўшы педагагічную адукацыю, або сыходзяць адтуль і мы не можам іх вярнуць.

У 2008 годзе Рос Макгіл пачаў весці свой настаўніцкі блог, а затым стварыў сайт teachertoolkit.co.uk — інструменты для настаўніка, у якога цяпер больш за 10 мільёнаў чытачоў, прасоўвае яго ў сацыяльных сетках.

— Апошнія два гады я вырашыў падарожнічаць, сустракацца з калегамі, дзяліцца ідэямі. Я не ведаю ўсе адказы — проста спрабую іх знайсці, і гэта робіць мяне ўплывовым чалавекам, — усміхаецца Рос. — Мая вялікая аўдыторыя дае мне магчымасць праводзіць апытанні і даследаванні, каб скласці пэўную карціну па тым ці іншым пытанні. Напрыклад, настаўнікі з усіх краін скардзяцца на вялікую колькасць справаздач і электронных лістоў, на якія ім даводзіцца адказваць. Я цікавіўся, чаму яны сыходзяць з прафесіі, апытаў каля тысячы педагогаў у Брытаніі. Для нашай краіны галоўнымі прычынамі сыходу з'яўляюцца высокая рабочая нагрузка, ціск з боку ўпраўлення стандартаў (гэта такі кантралюючы орган у адукацыі), дрэнныя паводзіны вучняў і нізкія заробкі. Сярэдняя рабочая нагрузка на настаўнікаў складае 45—55 гадзін на тыдзень. У кіраўнікоў школ яна можа дасягаць 80 гадзін. Самае крыўднае: грамадскасць не думае, што вы, дарагія настаўнікі, працуеце вельмі шмат. Таксама яны лічаць, што вам плацяць добра.

«Калі вы сустракаецеся са «складанымі» бацькамі сваіх вучняў, лепш не садзіцеся, а стойце, тады сустрэча пройдзе хутчэй», — яшчэ адзін жарт ад Роса. «Прызнайцеся, а хто з вас любіць настаўніцкія сходы? Нікому яны не падабаюцца, дык навошта яны нам тады патрэбныя? Лепш сустрэцца з калегамі ў кавярні... А ці падабаецца вам, калі да вас на ўрок прыходзяць і яго ацэньваюць? Нешта я не назіраў падобнага ў медыцыне», — кажа Рос Макгіл, працягваючы пералічваць прычыны, па якіх людзі не затрымліваюцца ў прафесіі.

**«Засталася ўсяго гадзінка, і #EdCampBelarus стане гісторыяй, — напісала ў «Фэйсбуку» дырэктар сталічнай сярэдняй школы № 2 Ала ЛАЗІЦКАЯ. — Сябры, ці магчымай была б такая неймаверная па прафесійнай і чалавечай энергетыцы падзея, калі б не ВЫ, дарагія эдкэмперы, эксперты, удзельнікі і валанцёры?! Дакладна, эфект доўгага хваста ад (не)канферэнцыі будзе. Няхай тыя практыкі, ідэі, кантакты, якімі мы шчодра дзяліліся і якія набывалі, трансфармуюцца ва ўнікальны сінергетычны эфект! Дзякуй гэтым двум насычаным дням))) Бывай, #EdCampBelarus2019! Мы паехалі напрацоўваць новы вопыт, каб было чым дзяліцца на #EdCampBelarus2020!!»**

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота арганізатараў EdCampBelarus—2019.

www.girza.by

Рассекатели веток «СЕКАЧ» и щепорезы «ДРОБНЯК» для переработки древесных отходов в дешевое топливо под пиролизные и твердотопливные котлы, камины, печи.
Производим и поставляем продукцию согласно запросу каждого клиента.



Работаем по всей территории РБ.
УНП 691586696

Тел. 8(029) 675 18 75

TOKYO 2020

275 дзён да Алімпіяды

# «УСЕ ЯГО ПАРАДЫ ВАЖНЫЯ, УСЕ ЗАСТАЮЦЦА Ў ГАЛАВЕ»

## Дачка алімпійскага чэмпіёна Сяргея Мартынава можа паўтарыць поспех бацькі

**Марыя выбрала стральбу не адразу: спачатку займалася плаваннем, але, дасягнуўшы звання майстра спорту, вырашыла, што больш не хоча прыходзіць у басейн. Толькі пасля дзявятага класа Маша папрасіла тату прывесці яе ў цір. Менавіта тут і пачалася дарослая спартыўная кар'ера.**



Гэты год для Марыі стаў насычаным на падзеі: спачатку выступленне на дамашніх Еўрапейскіх гульнях, потым сярэбраны медаль на чэмпіянаце Еўропы, а галоўнае — Мартынава заваявала ліцэнзію на Алімпійскія гульні 2020 года ў стральбе з малакалібернай вінтоўкі. Дарэчы, нашы спартсменкі ўжо 10 гадоў у гэтым відзе стральбы не маглі трапіць на Алімпіяду. Пра тое, як за шэсць гадоў Марыі ўдалося дасягнуць сур'ёзных поспехаў у стральбе, чаму у гэтым відзе спорту лепш не думаць пра перамогі, і што такое трэніравацца пад кіраўніцтвам бацькі, дзяўчына расказала ў сваім інтэрв'ю.

**— Марыя, цяперашні чэмпіянат Еўропы стаў для вас самым паспяховым. Ці чакалі атрымаць узнагароду і ліцэнзію менавіта на гэтым старце?**

— Не, добрага выступлення чакалі хутчэй у пачатку сезона, таму што я ўвесь час была дзесьці каля фіналаў. Летам пайшоў спад, пасля Еўрапейскіх гульняў выступіла яшчэ на этапе Кубка свету ў Рыа-дэ-Жанейра, але нічога асаблівага там не паказала,



таму гэтым разам наогул не разлічвала на ўзнагароды. Хоць усе ведалі, што я магу паказаць вынік, які выведзе мяне ў фінал.

**— Прыемным бонусам для вас стала алімпійская ліцэнзія?**

— Хутчэй, наадварот. Ліцэнзія ўсё ж такі важнейшая, а вось медаль ужо прыемны бонус. Яшчэ перад фіналам мяне пачалі віншаваць з заваяваннем ліцэнзіі, а калі ён пачаўся, аказалася, што ліцэнзіі яшчэ няма. Пуцёўкі ў Токіа было дзве, а прэтэндавалі на іх тры спартсменкі.

**— Гэта імянная ліцэнзія?**

— Не. Яшчэ невядома, хто дакладна паедзе на Алімпійскія гульні. Напэўна, гэта вырашыцца па выніках сезона. У апошнія гадоў дзесяць у беларусаў не было алімпійскіх ліцэнзій у жаночай вінтоўцы, таму, магчыма, у Токіа адпраўлюся менавіта я, але ўсё роўна гэта будзе вырашаць трэнерскі штаб. Цяпер у нас у жаночай камандзе добрая канкурэнцыя, праўда, яна не вельмі стабільная, ад старту да старту атрымліваецца па-рознаму.

**— Сёння гэтае «серабро» для вас самае важнае ў кар'еры?**

— Ёсць яшчэ бронзавы медаль з этапа Кубка свету, але ён выйграны ў камандзе, да таго ж там я не атрымала ліцэнзію, а тут і медаль асабісты, і ліцэнзія — вельмі прыемна.

**— Перайсці з плавання ў стральбу было складана? Гэта ж зусім розныя віды спорту і па фізічнай нагрузцы, і па псіхалогіі.**

— Складана было прыняць рашэнне пайсці з плавання, таму што я аддала яму шмат часу. Гэта было не самае спантаннае рашэнне, але і не доўгае, мне спатрэбілася каля месяца. Усё астатняе было нескладана, проста прыйшла і занялася новай справай. Прыйшла ў стральбу фізічна падрыхтаванай, можа, таму мне было лёгка.

Дарэчы, бацькі адрэагавалі на мой пераход спакойна, не хочаш плаваць — не плавай. Да таго ж я не сыходзіла з плавання, каб перайсці ў стральбу. Спачатку хадзіла на розныя курсы, так прайшло недзе паўгода. Усё гэта мне надакучыла, не хапала чагосьці спартыўнага, можа, рызыкі або адрэналіну, і я папрасіла тату, каб ён завёў мяне ў цір. Там спадабалася, пачала займацца. Да гэтага пару разоў ужо была ў ціры, але амаль нічога не памятаю.

**— Вынікі ў стральбе прыйшлі хутка?**

— На агульным фоне, можа, хутчэй, чым у астатніх, але, напэўна, толькі ад таго, што іншыя пачалі займацца ў раннім узросце і проста фізічна не маглі паказаць добрага выніку. І яшчэ ў мяне не было пераходнага перыяду з дзіцячага спорту ў юнацкі, з юнацкага ў дарослы. Я, напэўна, гады два пастраляла ў якасці юніёра і перайшла на дарослы ўзровень. Мне здаецца, гэта плюс, таму што многія псіхалагічна не вытрымліваюць, калі вынікі на дзіцячым узроўні ёсць, а потым гэта ўсё знікае.

**— Памятаеце свой першы паспяховы турнір?**

— Напэўна, яны пачаліся толькі сёлета, а да гэтага была проста напрацоўка вопыту.

**— Існуе два асноўныя міфы пра стральбу: фізічна ў гэтым відзе спорту наогул не трэба трэніравацца і неабходна мець ідэальны зрок...**

— Гэта сапраўды ўсяго толькі міфы. У нас задзейнічаныя шматлікія групы мышцаў, таму неабходна мець фізічную падрыхтоўку. Моцна закачваць мышцы рук, ног, спіны не трэба, але трэба, каб усё было ў добрай форме, не ў максімальнай, а ў аптымальнай. Каб і ногі трымалі, і рукі былі не слабыя, спіна не балела стаяць па тры гадзіны ў дзень з вінтоўкай. У нас няма спецыяльнага трэнера па фізпадрыхтоўцы, кожны сам выбірае, над чым працаваць, — у мяне гэта звычайна бег, плаванне, планка.

Самае доўгае практыкаванне ў нашым відзе — гэта стральба з трох становішчаў. Тры гадзіны доўжыцца кваліфікацыя, а праз паўгадзіны пачынаецца фінал, які працягваецца яшчэ гадзіну. Груба кажучы, у кваліфікацыі ў цябе ёсць па гадзіне на кожнае становішча, яе трэба адпрацаваць ад першага да саракавога стрэлу, потым «перакруціцца» і ўжо сканцэнтравацца на іншым становішчы ад пачатку да канца. Гэта значыць, чатыры гадзіны ты знаходзішся ў шалёнай канцэнтрацыі, бывае цяжкавата.

Што датычыцца зроку, то, калі ў спартсмена ён дрэнны, можна паставіць спецыяльную лінзу, якая будзе як манокль. Нельга выкарыстоўваць прыцэл, які павялічвае мішэнь, а вось лінзу можна. Калі занадта добра бачыш мішэнь, гэта напружвае, а калі яна трохі расплывістая, смялей націскаеш на спускавы кручок. Добры зрок можа стаць нават мінусам.

**— Трэніроўкі ў стралкоў доўжацца 2,5-3 гадзіны, што яны ўключаюць?**

— Увесь гэты час мы знаходзімся ў ціры. Можам проста стаяць напагатове і па гадзіне глядзець на мішэні, потым страляем халастымі, працуем з куляй або патронамі, з электроннымі трэнажорамі.

**— Ваш касцюм важыць каля 5 кг і каштуе не менш за 2 тысячы еўра, навошта ён?**

— Касцюм павялічвае ўстойлівасць, вінтоўка не так вагаецца, ён падтрымлівае мышцы, хоць нават і ў ім бывае, што баліць спіна. Таўшчыня і цвёрдасць касцюма рэгулююцца правіламі.

**— Чаго б вы хацелі дамагчыся ў спорце?**

— Калі хацець выйграць у стральбе, то, напэўна, мала што атрымаецца. Трэба проста быць гатовым паказваць стабільна высокі вынік, а ўжо трапіць ён у фінал ці не, залежыць не толькі ад цябе, бо іншыя восем стралкоў могуць паказаць яшчэ лепшы вынік, як бы добра ты ні быў гатовы.

**— Тата быў яшчэ дзеючым спартсменам, калі вы пачалі страляць?**

— Так. Гады чатыры мяне трэніраваў іншы настаўнік, але тата заўжды ўдзельнічаў у падрыхтоўцы *(смяецца)*. Ён заўсёды ўсіх кансультуе, сам не лезе, але калі хтосьці спытае савет або папросіць дапамогі, заўсёды падкажа. Цяпер ён мой трэнер.

**— Які галоўны савет ён вам даў?**

— Усе яго парады важныя, усе застаюцца ў галаве. Галоўнае, напэўна, тое, што на стральбе жыццё не заканчваецца, зацыклівацца на спорце не варта, трэба мець штосьці за спінай — адукацыю, іншае жыццё. І тата, і муж (ён таксама стралок — Ілля Шаплыка), вядома, часам выказваюць свае думкі пра мае выступленні, але ў нас такі добры від спорту: можна паслухаць, а зрабіць усё роўна па-свойму. Тым больш як спартсмены яны разумеюць, што гэта можа напружваць.

**— Татава вядомасць для вас — плюс ці мінус?**

— Для мяне плюс, што ў мяне такі дасведчаны трэнер, прафесіянал. Больш ні плюсоў, ні мінусаў няма. Людзі павінны разумець, што калі ён алімпійскі чэмпіён, гэта не значыць, што я абавязкова таксама павінна ёю стаць. У кожнага спартсмена ёсць такая мэта, але ў дзяцінстве я пра алімпійскі медаль не марыла, хапала, што бацька алімпійскі чэмпіён, а каб два такія чалавекі былі ў сям'і — гэта ўжо будзе вялікая рэдкасць. Усклалдаць такія нерэальныя надзеі на сябе, напэўна, не варта.

**— Бацька як тата і бацька як трэнер — розныя людзі?**

— Не. На трэніроўках ён, як і дома, робіць усё ідэальна і лепш за ўсіх.

**— Паслухаўшы параду таты не зацыклівацца на спорце, ці думалі, дзе маглі б сябе праявіць пасля спартыўнай кар'еры?**

— Мне заўсёды падабалася прафесія настаўніка, але цяпер для мяне больш актуальна трэнерская дзейнасць. Таму я і пайшла ў БДУФК вучыцца на трэнера. Мая першая вышэйшая адукацыя юрыдычная, але юрыстам я наўрад ці буду працаваць.

**— Стральба з тых відаў спорту, якімі складана зарабіць...**

— У нас невялікія заробкі, шыкаваць не атрымаецца. Хтосьці з дзяўчат у камандзе сумяшчае спорт з заробкам на манікюры, напрыклад. У Еўропе, наадварот, у стралкоў ёсць асноўная работа, а спорт — гэта толькі хобі. І яны з гэтым хобі прыязджаюць і добра трапляюць у цэль. Напэўна, праз тое, што не «парацца» з гэтай нагоды — у іх жа зарплата не залежыць ад таго, як яны выступаюць.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

# БОЛЬШ ЗА 9 ТЫСЯЧ СПАРТСМЕНАЎ СА 109 КРАІН СВЕТУ

## У Кітаі праходзяць Сусветныя ваенныя гульні, беларусы адкрылі лік узнагародам

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальных падзеі выхадных.**

**1. *Дзюдаіст Даніэль Мукетэ адкрыў лік узнагарод беларускай дэлегацыі на VII Сусветных ваенных гульнях у Кітаі, выйграўшы залаты медаль у вагавой катэгорыі 100 кг.*** Нагадаем, больш за 9300 спартсменаў-ваеннаслужачых са 109 краін свету спаборнічаюць з 18 да 27 кастрычніка ў 27 відах спорту па 329 дысцыплінах. У праграму спаборніцтваў увайшлі бадмінтон, стральба з лука, веласпорт, бокс, гольф, футбол, дзюдо, парашутны спорт, стральба, плаванне, трыятлон, валейбол, настольны тэніс, сучаснае пяціборства, конны спорт, фехтаванне, арыентаванне на мясцовасці, спартыўная барацьба, ваенна-авіяцыйнае пяціборства, ваенна-марское пяціборства, ваеннае пяціборства і іншыя віды.

**2. *Таццяна Шаракова выйграла «бронзу» і «серабро» на чэмпіянаце Еўропы па веласпорце на трэку ў Нідэрландах.*** Трэцяе месца беларуска заняла ў омніуме, а другое ў гонцы па ачках.

**3. *Людміла Псышчаніца (вагавая катэгорыя 55 кг) заваявала залатую ўзнагароду на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы па цяжкай атлетыцы, які праходзіць у Бухарэсце.*** Беларуска паказала вынік у 189 кг (83 + 106) у суме дваябор'я (рывок і штуршок).

У Бухарэсце на юніёрскім (U20) і маладзёжным (U23) чэмпіянатах Еўропы ўдзельнічаюць каля 500 спартсменаў з 40 краін. Абодва турніры ліцэнзійныя і даюць атлетам права зарабіць ачкі ў алімпійскі рэйтынг Токіа-2020. Юніёрскі чэмпіянат носіць залаты статус, маладзёжны — сярэбраны.



**4. *Беларускі баксёр Мікалай Весялоў на турніры ў Бельгіі абараніў чэмпіёнскі пояс Сусветнай баксёрскай асацыяцыі — WBA Continental.*** Наш спартсмен выйграў бой у сярэдняй вагавой катэгорыі (72,5 кг) у датчаніна Абдула Хатаба.

**5. *Адбыліся матчы 25-га тура чэмпіяната краіны па футболе.*** Брэсцкае «Дынама» ўмацавала сваё лідарства, перамогшы футбалістаў «Слуцка» — 3:2, а іх асноўныя канкурэнты — БАТЭ — страцілі ачкі, згуляўшы ўнічыю з «Гомелем» — 1:1. Салігорскі «Шахцёр» сенсацыйна прайграў у Магілёве мясцоваму «Дняпру» — 0:2. Такім чынам, адрыў брэсцкага «Дынама» ад найбліжэйшых праследаваццеляў складае ўжо 7 ачкоў.

*Вынікі іншых сустрэч 25-га тура:* «Дынама» (Мінск) — «Віцебск» — 0:2, «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Іслач» (Мінскі раён) — 1:3, «Славія» (Мазыр) — «Нёман» (Гродна) — 0:1.

Становішча ў групе лідараў зараз такое: «Дынама» (Брэст) — 64 ачкі (25 матчаў), БАТЭ — 57 (24), «Шахцёр» — 57 (25), «Дынама» (Мінск) — 45 (24).

**6. *Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова пацярпеў чацвёртае паражэнне ў Лізе чэмпіёнаў, саступіўшы на сваёй арэне польскаму «Віве» з Кельцаў — 27:31.*** У складзе гаспадароў самым выніковым стаў Вільям Акамбрэ, які закінуў 6 мячоў, у гасцей столькі ж разоў адзначыўся беларус Уладзіслаў Кулеш.

Турнірнае становішча пасля пяці гульнявых дзён: «Кіль» — 9 ачкоў, «Веспрэм» — 6, «Манпелье» — 6, «Вардар» — 6, «Віве» — 5, «Порту» — 5, БГК — 2, «Матор» — 1.

БГК імя Мяшкова свой наступны паядынак правядзе 3 лістапада ў Скоп'е супраць «Вардара».

# РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 06.11.2019 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 644/С-38902, общей площадью 56,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, СТ»Дружба-Овины», уч. 41. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: садовый, дачный домик (дача). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625000000033000017 площадью 0,0475 га. **Начальная цена продажи 16 912,8 руб., задаток – 1 691,28 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-66172, общей площадью 19,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Симонова, гаражно-эксплуатационный кооператив «Симонова», блок № 16, гараж № 41. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: здание гаража. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003897 площадью 18,0964 га. **Начальная цена продажи – 1 863,00 руб., задаток – 186,3 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-73344, общей площадью 20,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ПГК «Чисть-2007», 35. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: индивидуальный капитальный гараж. **Начальная цена продажи – 1 701,00 руб., задаток – 170,1 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инвентарным номером 720/D-17406, общей площадью 1137,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, ул. Советская, 9-3. Назначение: административно-торговое помещение, наименование: изолированное помещение. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 722050100001001085 площадью 0,1331 га. **Начальная цена продажи – 545 040,00 бел. руб., задаток – 54 504,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708145687, общей площадью 1453,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 11А-4. Назначение: производственное помещение, наименование: производственное помещение. **Начальная цена продажи – 601 344,00 бел. руб., задаток – 60 134,4 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-30393, общей площадью 47,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Молчанова, д. 18. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: одноквартирный жилой дом, составные части и принадлежности: кирпичный и дощатый сараи, остекленная рассадница. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 144500000015000355 площадью 0,0674 га. **Начальная цена продажи – 32 832,00 бел. руб., задаток – 3 283,2 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Индивидуальный капитальный гараж, инвентарный номер 130/С-(не зарегистрирован в ЕГРНИ), общей площадью 20,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Интернациональная, 12/265. Наименование гаражного кооператива: ГПК № 8, г. Пинск. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 144500000014000024. **Начальная цена продажи – 3 110,4 бел. руб., задаток – 311,04 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Индивидуальный капитальный гараж, инвентарный номер 130/С-(не зарегистрирован в ЕГРНИ), общей площадью 25,3 кв. м, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Интернациональная, 12/286. Наименование гаражного кооператива: ГПК № 8, г. Пинск. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 144500000014000024. **Начальная цена продажи – 2 764,8 бел. руб., задаток – 276,48 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-14367, общей площадью 60,0 кв. м, расположенный по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, Стайковский с/с, д. Нехачево, ул. Брестская, 6. Назначение: здание из блоков, облицованных кирпичом одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом № 6. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 123488002601000132 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 11 340,00 бел. руб., задаток – 1 134,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-14367, общей площадью 60,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, Стайковский с/с, д. Нехачево, ул. Брестская, 6. Назначение: здание из блоков, облицованных кирпичом одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом № 6. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 123488002601000132 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 9 720,00 бел. руб., задаток – 972,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-85447, общей площадью 21,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, массив гаражей по пер. 2 Бадака (вблизи металлобазы), блок 1, бокс 3. Назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000001001023 площадью 0,0191 га. **Начальная цена продажи – 1 845,00 бел. руб., задаток – 184,5 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-53083, общей площадью 830,6 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Советская, 4/3. Назначение: здание арочника, наименование: одноэтажное кирпичное, метало-каркасное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 322350100001000159 площадью 10,8010 га. **Начальная цена продажи – 85 449,60 бел. руб., задаток – 8 544,96 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-76538, общей площадью 3262,2 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, д. 84. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование: здание СТО А. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000003001198 площадью 1,2887 га. **Начальная цена продажи – 418 176,00 бел. руб., задаток – 41 817,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-8130, одноэтажный каменный гараж № 134 с подвалом, смотровой ямой, общей площадью 18,3 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл.,Оршанский район, г. Орша, район Орша-Восточная, массив гаражей, гараж 134. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 242400000001002969. **Начальная цена продажи – 2 779,2 бел. руб., задаток – 277,92 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-9197, общей площадью 46,1 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кличевский р-н, Долговский с/с, д. Долгое, ул. Заречная, д. 60. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом, составные части и принадлежности: одноэтажный бревенчатый жилой дом с холодной пристройкой, двумя сараями. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 723081603101000164 площадью 0,0514 га. **Начальная цена продажи – 4 838,4 бел. руб., задаток – 483,84 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42061, общей площадью 577,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/8. Назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: сборно-троссовая мастерская. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 площадью 5,3062. **Начальная цена продажи – 63 072,00 бел. руб., задаток – 630,72 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

